

УТАЙМАВАЛЬНІКІ АГНЮ

ЧЫРВОНКА

«РАСЛІНЫ — ГЭТА МАЁ ЖЫЦЦЁ»

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 ВЕРАСНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 181 (29295)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір УЛАХОВІЧ, старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты:**

*«Рэакцыя на палітычныя падзеі ў Беларусі не пераносіцца на бізнес-адносіны. Бізнес усё ж такі імкнецца абараняць свае інтарэсы, і гэта зразумела. Больш за тое, усе зацікаўленыя, каб не было падзення таго, што ўжо напрацавана. Некаторыя «нованароджаныя» эксперты кажуць, што Беларусь нічога не выпрабляе, што гэта адсталы край, а прадукцыя — мінулага стагоддзя. Хіба гэта мае хоць нейкае дачыненне да рэчаіснасці? Вялікабрытанія, напрыклад, збіраецца арганізоўваць з намі зборачную вытворчасць электробусаў. Хіба гэта выпадковасць? Не. Таму такія каментарыя недапушчальныя і непатрэбныя. Але тыя людзі, якія займаюцца практычным бізнесам, ведаюць рэальную карціну, і яны зацікаўленыя захаваць дзелавыя адносіны з беларускімі партнёрамі».*

# ЦУДАДЗЕЙНАЯ КРЫНІЦА



Крыніца ў вёсцы Покрашава Слуцкага раёна прыцягвае не толькі месцічаў. Тут бываюць землякі з блізкіх і аддаленых ад гэтых мясцін вёсак, выпадковыя і сталыя путнікі, жыхары Слуцка, хлебаробы і будаўнікі. Гаючая вада, быццам родная маці, кліча іх і частуе. Шмат гадоў таму, дзякуючы Покрашаўскаму воцатнаму заводу, крынічная пляцоўка паўстала ў новым убранні.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Традыцыйны восеньскі месячнік па навядзенні парадку стартуе ў Мінску 19 верасня.**
- Запуск БелАЭС плануецца прымеркаваць да 7 лістапада.
- **У год святкавання 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне Віцебскі абласны краязнаўчы музей прапануе ўсім жадаючым прыняць удзел у акцыі «І ў памяці, і ў сямейным альбоме...».**
- Беларускія аграрыі намалацілі 8,025 млн т збожжа.

Актуальна

## БОЙЦЕСЯ НЕ ГРЫПУ, А ЯГО ЎСКЛАДНЕННЯЎ

### Чаму ў гэтым эпідсезоне варта абавязкова прышчапіцца?

**Масавая кампанія па вакцынацыі ад грыпу распачата сёлета ў краіне з сярэдзіны верасня. Звычайна яе праводзілі з кастрычніка, але свае карэктывы ў тэрміны вакцынацыі ўносіць іншая інфекцыя — COVID-19, якая працягвае распаўсюджвацца. Хто першым атрымае вакцыну і ці ёсць да яе супрацьпаказанні? Чаму гэтай восенню медыкі ўсім рэкамендуюць абараніць сябе ад грыпу? На актуальныя пытанні пра прышчэпкі ад грыпу адказала намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі Мінска Ларыса ДЗЯНІСАВА.**

— Вакцынацыя ад грыпу ў нас ужо актыўна вядзецца. Мы выкарыстоўваем расійскую вакцыну «Грыпол плюс». У папярэднія гады яна сябе добра зарэкамендавала. Вакцына ўтрымлівае актуальныя антыгены да штамаў віруса грыпу А — H1N1 і H3N2 і грыпу В, — расказвае Ларыса Уладзіміраўна.

СТАР. 4

Па палічках

## Ціхае паляванне можа быць небяспечнае

### Грыбны сезон: як не атруціцца?



**Фота ў VK: пяць поўных вёдраў грыбоў, на пярэднім плане — вядзерца з баравікамі. І подпіс: «Гэта толькі да абеду!». Падобныя фота з надыходам восені пастаянна сустракаюцца ў сацсетках. Нічога дзіўнага: грыбны сезон. Звярніце з трасы на прасёлак у будны дзень і асабліва ў выхадны: на абочынах уздоўж ускрайку лесу — дзясяткі прыпаркаваных машын. Ціхае паляванне — адна з тых простых радасцяў, якія ненадоўга вяртаюць у дзяцінства. Але каб радасць заставалася радасцю і за яе не прыйшлося плаціць здароўем, трэба памятаць аб мерах перасцярогі.**

СТАР. 9

ISSN 1990 - 763X

20181>

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

З першых вуснаў

# «ЧАС БАРЫКАД І МІТЫНГАЎ ЗАВЯРШЫЎСЯ»

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка расказаў пра апрабаваную на Беларусі новую генерацыю «каляровых» тэхналогій

**Учора ў Палацы Незалежнасці адбылася сустрэча кіраўніка дзяржавы з актывам краіны. Як заявіў Прэзідэнт, ён запрасіў яго на сустрэчу, каб азнаёміць з аператыўнай аналітычнай інфармацыяй, «якая дасць адказы на самыя вострыя пытанні сённяшняга дня і дапаможа лепш сарыентавацца ў палітычнай сітуацыі ўнутры і вакол Беларусі».**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што паэтапны разбор падзей у краіне выяўляе сапраўдныя задумы і тактыку знешніх нават не апанентаў Беларусі, а агрэсараў. Прэзідэнт заявіў, што на працягу апошніх дзесяці гадоў яны скрупулёзна рыхтаваліся да цяперашняга часу «Ч». «Каб адразу зняць усе маскі, назавём гэтых гульцоў пайменна. На ўзроўні глабальных цэнтраў гэта перш за ўсё Злучаныя Штаты Амерыкі, больш канкрэтна — іх сетка фондаў па падтрымцы так званай дэмакратыі. На еўрапейскім кантыненце актыўна дзейнічалі амерыканскія сатэліты: Польшча, Літва, Чэхія і, на жаль, наша Украіна», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кожная з гэтых краін выканала сваю ролю, падкрэсліў ён. Чэхія — з даўніх часоў у якасці рэсурснага хаба, Польшча — спачатку як інкубатар медыяканалаў («Белсат», «Нехта» і іншыя), а затым як пляцоўка для альтэрнатыўных органаў у выгнанні. «Літва, абражаная тэмай БелАЭс, — як таран беларуска-еўрапейскіх адносін. Украіна, нягледзячы на нашу нязменную яе падтрымку (напрыклад, у пытаннях тэрытарыяльнай цэласнасці ды і па іншых), насуперак духу нашых узаемаадносін стала фарпостам палітычных правакацый, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Такім чынам, мы выразна бачым суб'ектаў гэтага працэсу, іх правадыроў і памагатых. Тактыка арганізатараў будавалася па класічным амерыканскім падручніку «каляровых рэвалюцый». Гэта ўсім вядомы Джын Шарп. Цяпер мы можам азірнуцца назад і дэталёва разабраць усе этапы сцэнарыя па знішчэнні нашай краіны, якому мы, на шчасце, не дазволілі рэалізавацца і не дазволім».

***«Беларускі сцэнарый 2020 года прадстаўляе сабой сплаў з найбольш эфектыўных «каляровых» тэхналогій дэстабілізацыі, якія атрымалі апрабацыю ў розных краінах.*** Відавочная стаўка на маштаб і працягласць пратэстаў, вымотванне сіл і знясіленне рэсурсаў. Мы ведаем, хто кіруе, хто часта-небудзь хоча ў Беларусі, і таму не расслабляемся і гатовыя адказаць на любы выклік», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

«Сёння мы выходзім з таго няпростага перыяду, які перажывалі каля двух месяцаў. Гаворка ідзе нават не пра краіну, а пра Мінск і яшчэ два-тры гарады, дзе групы вечна незадаволеных спрабавалі падарваць палітычную абстаноўку і разбурыць нашу грамадскую стабільнасць — галоўны брэнд нашай краіны. І па гэтым наносіўся ўдар», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што ўвесь гэты час астатняя краіна жыла і жыве сваім штодзённым жыццём: людзі вырошчваюць і прыбіраюць з палёў небывалы ўраджай, мадэрнізуюцца прадпрыемствы, у большых аб'ёмах, чым у мінулым годзе, будуюцца дамы, школы і бальніцы, рыхтуецца да запуску атамная станцыя. «Мы не стаім на месцы, мы ўвесь час у руху, краіна развіваецца, паэтапна расце дабрабыт людзей. Не разумею, якія яшчэ патрэбныя перамены. Трэба проста паскарацца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы лічыць вельмі важным, што ў такой складанай сітуацыі ў кіраўнічай вертыкалі, у сілавым блоку, у активе патрыятычных аб'яднанняў і партый ніхто нават не завагаўся. «Я ўбачыў людзей у справе, зразумеў, што мяне ўвогуле атачаюць устойлівыя і адданыя нашай Айчыне людзі. Дзякуй тым, хто сябе паводзіў прыстойна і надзейна», — адзначыў Прэзідэнт.


Фота БелТА.

«Асноўныя ўрокі мы вынеслі. Мы ведаем, дзе і з кім недапрацавалі, у бліжэйшы час ліквідуем (ужо пачалі гэта рабіць) недахопы, якія выявіліся. Далучайцеся да гэтага. Закрыем праблемы на ўнутрыпалітычным фронце. ***Ужо сёлета Беларусь павінна і вернецца да бяспечнага перыяду, які быў у нас заўсёды ў Мінску. Час барыкад і мітынгаў завяршыўся.*** Цяпер — наш час, неабходна працягнуць стварэнне, рух наперад праз разумныя перамены і рэформы, пра якія мы гаворым», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «трасе» сёння не толькі ў Беларусі. Больш за 40 краін за апошнія гады было ахоплена масавымі акцыямі пратэсту і рэвалюцыямі. Ён прывёў канкрэтныя прыклады беспарадкаў, якія не спыняюцца ў Злучаных Штатах, Францыі, Германіі, Балгарыі, захоўваецца турбулентнасць у Чарнагорыі, кітайскім Ганконгу, у Расіі. «Свет ужо дакладна не будзе ранейшым. Нічога новага, я вам пра гэта казаў: пандэмія пройдзе, дзе будзем мы? Свет не будзе тым, што быў да пандэміі. Але Беларусь павінна і вернецца да нармальнага жыцця, у тым ліку ў горадзе-героі Мінску», — паўтарыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка паставіў задачы па падрыхтоўцы да Усебеларускага народнага сходу. «Ад сістэмнага руху наперад мы не адступім. Не за гарамі новая пяцігодка, якая павінна стаць для Беларусі прарыўной. ***У найбліжэйшыя гады краіна павінна ўвайсці ў шосты тэхналагічны ўклад, што азначае далейшае эканамічнае развіццё дзяржавы: уласная энергетыка, экалагічная і канкурэнтаздольная вытворчасць, найвышэйшая, на ўзроўні сусветных стандартаў якасць беларускай прадукцыі»,*** — абазначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што Усебеларускі народны сход намечана правесці ў снежні або студзені. «Гэта вельмі важны орган, асаблівая форма народаўладдзя ў краіне, якая тады, у сярэдзіне 90-х, выратавала краіну», — сказаў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў свой час правёў першае такое мерапрыемства, форум народа, каб абаперціся на людзей, звярнуцца да іх з заклікам дапамагчы выратаваць краіну. «Падтрымайце мяне — я зраблю ўсё, каб была краіна. Я выканаў гэтае абяцанне. Гэта быў значны сход», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы аб маючым адбыцца Усебеларускім народным сходзе, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што на ім трэба будзе абмеркаваць грамадска-палітычныя і эканамічныя пытанні, планы, вызначыць асноўныя этапы развіцця Беларусі на найбліжэйшыя пяць гадоў. «І там мы павінны намаляваць план у тым ліку і канстытуцыйных змен. І да гэтага прапрацуем і па партыях, і па іншых пытаннях, каб усё бачыць, на якім свеце мы знаходзімся. Таму падрыхтоўка да Усебеларускага сходу — найважнейшая палітычная задача найбліжэйшых дзён», — заявіў Прэзідэнт.

Ён даручыў кіраўнікам Адміністрацыі Прэзідэнта і ўрада, кіраўнікам аблвыканкамаў, Мінгарвыканкама ўважліва падысці да пытання абрання дэлегатаў. ***«Гэта будзе агульнанацыянальны дыялог. Таму браць удзел у форуме павінны прадстаўнікі ўсіх слаёў грамадства, усіх сацыяльных і прафесійных груп, патрыятычных аб'яднанняў, дэпутаты ўсіх узроўняў.*** Дэлегаты павінны быць ад кожнага буйнога прамысловага прадпрыемства. Не толькі кіраўнікі, але і працоўныя ад станка, якія прадстаўляюць працоўныя калектывы», — сказаў Прэзідэнт.

«З грамадствам трэба працаваць больш эфектыўна, выходзіць на новы ўзровень узаемадзеяння. Магчыма, на базе канструктыўных арганізацый варта стварыць мясцовыя дыялогавыя пляцоўкі. Трэба стварыць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што для шырокага дыялогу важна, каб да гэтага на ўзроўні абласцей далучаліся губернатары, а таксама ўрад, вышэйшыя службовыя асобы, аж да Прэзідэнта. «Я абсалютна пераканаyы, і сам гатовы пачынаць гэтую працу. Знізу», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Ён дадаў, што ў такіх мерапрыемствах абавязкова павінны браць удзел і палітыкі, у тым ліку дэпутаты. «Вы павінны быць галоўным маторам гэтага дыялогу», — адзначыў Прэзідэнт.

«Сёння надышоў час надаць новы імпульс грамадска-палітычнаму жыццю. Важна сфарміраваць адзінае бачанне таго, якой у перспектыве павінна быць наша краіна, яе дзяржаўны лад. Гэта Канстытуцыя, — сказаў беларускі лідар. — ***Мы выбары правялі, вынік атрымалі. На гэтым кропка. Напэўна, хопіць бударажыць грамадства. Наступныя прэзідэнцкія выбары — па Канстытуцыі.*** Як вызначымся, так і будзе».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, у новай Канстытуцыі варта прапісаць абмежаванні і процівагі, баланс улады. Усе адпаведныя навацыі павінны быць абмеркаваны на Усебеларускім народным сходзе. «Праект новай Канстытуцыі ўжо, напэўна, трэці. Над ім працуюць. Не думайце, што простая праца. І вось гэты першапачатковы варыянт — праект — будзе ўнесены на абмеркаванне ўсіх галін улады», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Калі працэс абмеркавання завершыцца, канчатковы праект новай Канстытуцыі будзе вынесены на рэферэндум. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, да таго як будзе прынятая новая Канстытуцыя, трэба вярнуцца да партыйнай сістэмы, прайсціся па законе аб палітычных партыях. «Давайце спакойна займацца гэтай працай. Вялікая справа не робіцца спехам, яна павінна выспець, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Раней мы не займаліся сур'ёзна партыйным будаўніцтвам. Не было запыту на партыі».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што ***сучаснае грамадства структуруецца, і яно павінна мець свае палітычныя арганізацыі, уключаючы партыі.***

«Ужо даўно ідзе праца над новым законам (аб палітычных партыях), але патрэбен вынік», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Неабходна ўдасканальваць наша выбарчае заканадаўства, — пераканаyы кіраўнік дзяржавы. — На прэзідэнцкіх выбарах, на парламенцкіх выбарах, якія прайшлі ў мінулым годзе, выяўлены цэлы шэраг нестыковак, розных шчылін, якімі карыстаюцца нядобрасумленныя кандыдаты і іх давераныя асобы».

«Старшыні Канстытуцыйнага суда сумесна з Цэнтрвыбаркамам усе гэтыя пытанні трэба падняць і прапрацаваць. Паглядзіце, магчыма, патрэбныя навацыі, нейкія тэхнічныя рашэнні. Галоўнае, каб не на шкоду справе», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка працягнуў: «Падумайце аб павышэнні статусу членаў выбарчых камісій усіх узроўняў. Яны выконваюць дзяржаўную задачу, і дзяржава павінна надзейна абараніць іх ад правакатараў і іншых агрэсіўных людзей. Гэта прынцыповае пытанне».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўжо цяпер трэба пачынаць падрыхтоўку да выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў, паколькі яны першыя ў чарговым выбарчым цыкле.

«Адміністрацыю Прэзідэнта прашу ў бліжэйшы час унесці прапановы па арганізацыі эфектыўнай сістэмы ідэалагічнай работы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, свае ўрокі павінна вынесці і Міністэрства адукацыі. «Прапрацуйце прапановы па арганізацыі выхаваўчай работы ва ўстановах адукацыі ўсіх тыпаў, — даручыў Аляксандр Лукашэнка. — Калі неабходна, прадумайце пытанні самакіравання ў ВНУ, але ў межах разумнага».

Прэзідэнт нагадаў, што ***сродкі масавай інфармацыі павінны быць праваднікамі дзяржаўнай ідэалогіі, а журналісты — самай дзяржаўнай катэгорыяй спецыялістаў.***

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што, мабыць, ёсць сэнс адпрацаваць з грамадствам даўно наспелыя пытанні рэфармавання мясцовага самакіравання. «Прыйшла пара іх разгледзець. Як мінімум гэтыя органы павінны больш актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні ўзнікаючых пытанняў і праблем на месцах і праяўляць ініцыятыву», — лічыць ён.

Пры гэтым Прэзідэнт звярнуў увагу: «Калі мы вывучым прапановы ад грамадскасці, разбяромся з партыйным заканадаўствам, усёй партыйнай сістэмай, дапрацуем выбарчае заканадаўства, тады мы ўсе гэтыя моманты будзем «зашываць» з канстытуцыйнай рэформай. Але не наадварот».

«Вядома, гэта далёка не ўсе задачы, якія нам трэба будзе вырашаць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

На сустрэчы з палітычным актывам краіны беларускі лідар выказаў упэўненасць, што разам мы вернем у Беларусь спакойны рытм жыцця.

«Шмат будзе працы», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы. — Я ўжо казаў, што сістэма трымаецца на адданых сваёй краіне людзях. Апошнія месяцы паказалі, што такіх людзей большасць».

З першых вуснаў

# «МЫ Ў СТАНЕ ЎТРЫМАЦЬ СІТУАЦЫЮ НЕ ТОЛЬКІ Ў БЕЛАРУСІ, АЛЕ І ПА ПЕРЫМЕТРЫ НАШЫХ МЕЖ»

**Заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Міністрам абароны Расіі Сяргеем Шайгу.**

«Мы дамовіліся з Прэзідэнтам Расіі, што нам трэба працягнуць вучэнні на тэрыторыі Беларусі «Славянскае брацтва», якія праходзяць пад Брэстам. Мы вітаем гэтыя вучэнні, і добра, што яны праходзяць, прытым, як мне дакладваюць, паспяхова. Трэба падумаць аб другім этапе вучэнняў і іншых вучэннях, выпрацаваць план, не аглядаючыся на бакі, хто нам і што скажа, — цытуе Аляксандра Лукашэнку яго прэс-служба. — Мы не збіраемся нікога напружваць, нахабна нешта рабіць, але свае інтарэсы мы павінны ахоўваць».

Расійская ваенная дэлегацыя на чале з Міністрам абароны Сяргеем Шайгу прыляцела ў Беларусь з рабочым візітам. У час сустрэчы ў Мінску пройдзе абмеркаванне пытанняў двухбаковага ваеннага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. «Я таксама прасіў Прэзідэнта Расіі аб некаторых тыпах узбраенняў. Сказаў яму, што, калі вы прыедзеце, мы паглядзім, што нам і дзе трэба рэальна ўмацаваць у плане Саюзнай дзяржавы. Баяцца няма чаго, мы гатовыя на гэта ісці. ***Апошнія падзеі паказваюць, што трэба смялей абараняць інтарэсы і беларусаў, і расіян. Так здарылася, што мы ў гэтым плане засталіся адны, але не самыя слабыя»***, — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Калі хто-небудзь думае, што Беларусь аслабла, што не выстаім, што Расія адыдзе ў бок, гэта для дурняў развагі. Мы ў стане ўтрымаць сітуацыю не толькі ў Беларусі, але і па перыметры нашых меж. Вы можаце не сумнявацца ў нашай надзейнасці ў плане абароны нашай агульнай Айчыны — ад Брэста да Уладзівастока, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Апошнія падзеі нас яшчэ больш схіляюць да таго, каб мы трымаліся разам і каб ні ў якім разе не ўдалося забіць клін паміж намі ўсім тым, хто на гэта разлічваў і разлічвае».

Кіраўнік абароннага ведамства ў сваю чаргу расказаў, што на гэты год у беларускіх і расійскіх вайскоўцаў было вызначана каля 130 сумесных мерапрыемстваў: вучэнні, сустрэчы, сумесныя пасяджэнні як у фармаце двухбаковага супрацоўніцтва, так і на міжнародных пляцоўках. Цяпер, напрыклад, праходзіць вучэнне «Славянскае брацтва». «На жаль, праграму выканалі толькі на 30 %. Нам трэба да канца года выйсці хоць бы на 70 %. А для гэтага трэба ўшчыльняцца і праводзіць другі этап вучэнняў, якія ідуць цяпер. У кастрычніку ў нас будуць наступныя вучэнні», — дадаў Сяргей Шайгу.

Меркаванне

# СПАКОЙ, ШЧАСЦЕ, ДАБРЫНЯ

## Вядомыя спартсмены заклікаюць падтрымаць мір і стабільнасць у Беларусі

**Аляксандр Багдановіч, Максім Недасекаў, Наталля Цылінская, Настасся Ракапенка, Іван Ціхан і іншыя знакамітыя спартсмены — актыўныя ўдзельнікі вела- і аўтапрабегаў у падтрымку міру і стабільнасці ў Беларусі. «Я вырасла пад гэтым сцягам, пад гэтым сонцам, у гэтай стабільнасці. З тым, што мы не баімся выязджаць за мяжу. Мяне ўсё гэта задавальняе. Я за тое, каб былі стабільнасць, дабрабыт для мяне і маіх дзяцей. Калі ў краіне будуць панаваць спакой, шчасце, дабрыня і станоўчыя эмоцыі — будзе стымул развівацца і імкнуцца да новых дасягненняў. Людзі пачнуць думаць пра штосьці новае, развіваць і ўдасканальваць краіну», — адзначыла Настасся Ракапенка, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў — 2008 у сучасным пяцібор'і.**

Вялікі ўклад дзяржавы ў развіццё спорту падкрэсліў і праслаўлены беларускі лёгкаатлет Іван Ціхан, удзельнік мітынгу ў падтрымку міру і стабільнасці ў Гродна: «Развіццё спорту — адзін з галоўных прыярытэтаў сацыяльнай палітыкі беларускай дзяржавы. Для ўсіх жадаючых займацца фізічнай культурай у краіне пабудавана нямала выдатных стадыёнаў, палацаў, пляцовак, на якім кожны можа ўдасканальваць сваё майстэрства. Срэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў заклікаў усіх «нягледзячы на шматстайнасць самай супярэчлівай інфармацыі, захоўваць спакой і разумна ацэньваць сітуацыю, не паддаючыся на правакацыі».

Не засталіся ў баку і найлепшыя трэнеры краіны. «Беларускія спартсмены заўсёды імкнуцца высока несці сцяг роднай краіны. За апошнія дзесяцігоддзі ў нашай краіне зроблена нямала для таго, каб паказваць высокія вынікі. Упэўнены, беларускі спорт здольны дамагчыся гучных перамог з дапамогай дзяржавы», — выказаўся галоўны трэнер нацыянальнай каманды па цяжкай атлетыцы Віктар Шаршукоў.

Сваё меркаванне ў інтэрв'ю тэлеканалу СТБ выказаў і галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па веславанні на байдарках і каноэ Уладзімір Шантаровіч: «Сёння ёсць людзі, якія крыху праглядаюцца ў рэжыме трох разуменняў. Сёння гэта тыя, якія раўнадушныя, ім усё роўна. Ёсць людзі, якія хочуць стабільнасці, спакою, міру, дабрыні і ўзаемаразумення, сяброўства — гэта заўсёды было ў нашага народа. І ёсць людзі — рамантыкі, якія сёння не ведаюць, чаго яны хочуць».

Многае звязвае з Беларуссю расійскага фігурыста Аляксея Ягудзіна: тэлевізійныя і спартыўныя праекты, клуб фігурнага катання, які ўжо год дзейнічае ў Мінску. Сам алімпійскі чэмпіён неаднаразова прызнаваўся ў любові да Мінска: «Я хоць і рускі спартсмен, але не магу заставацца раўнадушным да сітуацыі ў Беларусі. Я лічу гэта чалавечай трагедыяй, што мяне надта кранае. Гэтую сітуацыю можна параўнаць з вялікай сям'ёй, дзе шмат розных пакаленняў, якія любяць адно аднаго. Зараз у вялікай беларускай сям'і наступіў разлад, што часам здараецца. Але, каб захаваць сям'ю, адной любові недастаткова, патрэбен кампраміс, дыялог. Мяне заўсёды прываблівала шчырасць, цеплыня беларусаў, і я спадзяюся, гэтыя рысы дапамогуць ім знайсці правільнае рашэнне».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Ва ўрадзе

# Не парываючы традыцый і супрацоўніцтва

**Урад па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь робіць усё неабходнае для аказання дапамогі паломнікам-хасідам. Аб гэтым заявіў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Дзяржавы Ізраіль у Беларусі Аланам ШОГАМАМ.**



Фота БелТА.

Зараз у Беларусі знаходзіцца 2558 паломнікаў-хасідаў, у тым ліку ў памежных з Украінай раёнах — каля 1200 чалавек, якія планавалі трапіць у сумежную дзяржаву на святкаванне 19 верасня Новага года па яўрэйскім календары. У асноўным яны сканцэнтраваны ў Гомельскай вобласці і горадзе Пінску.

Кабінет міністраў Украіны ў мэтах барацьбы з распаўсюджваннем каранавіруснай інфекцыі да 29 верасня ўвёў абмежаванні на ўезд у краіну замежных грамадзян і асоб без грамадзянства. Таму пагранічная служба адмаўляе ва ўездзе паломнікам.

«Мы гатовыя аказаць усё неабходнае садзейнічанне грамадзянам Ізраіля. Палаткі, абаграванне, вада, кашэрная ежа — усім гэтым яны забяспечаны. Санітарна-эпідэміялагічная служба кантралюе сітуацыю на месцы часовага знаходжання хасідаў. Санэпідрэжым знаходзіцца ў зададзеных параметрах. Зваротаў па медыцынскую дапамогу не было, у выпадку неабходнасці яна будзе аказана. Калі патрэбна, мы можам правесці ПЦР-тэсціраванне на каранавірус. Акрамя таго, мы гатовыя даць аўтобусы для паездкі паломнікаў ва Украіну і назад», — перадае словы Ігара Петрышэнкі прэс-сакратар урада.

Прэзідэнт Беларусі даручыў ураду дамовіцца з Украінай аб прадастаўленні «зялёнага калідора» для яўрэяў-хасідаў. Узаемадзеянне вядзецца па лініі кіраўніцтва Кабінета міністраў, Міністэрства замежных спраў і пасольстваў, пагранведамстваў, Міністэрства аховы здароўя, Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў.

«Мы вельмі актыўна працуем з украінскімі калегамі. Робім усё для таго, каб хасіды маглі рэалізаваць свае памкненні і наведаць святыя месцы», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Па стане на ўчора звароты беларускага боку прапрацоўваліся ўкраінскім.

Слова — чытачам «Звязды»

# ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ І ПАВАГА ДА ЧАЛАВЕКА

**Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзь ЯГОРАЎ:**



— Мне падабаецца, калі газета ўсебакова раскрывае грамадска-палітычныя тэмы, у ёй адчуваецца нацыянальны інтарэс. «Звязда» — адзінае, унікальнае выданне ў гэтым плане. У ёй многа цікавых матэрыялаў, прысвечаных праблематыцы Года малой радзімы, краязнаўству, важка падаюцца матэрыялы пра нацыянальную культуру і мастацтва, ахову здароўя. Вельмі люблю чытаць аналітычныя артыкулы. Многа друкуецца матэрыялаў для моладзі — яны падаюцца з жывінкай, каларытна і могуць быць цікавыя для рознай аўдыторыі.

Нядаўна з задавальненнем пачытаў артыкул пад рубрыкай «Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары». Лічу, што ў нашай Віцебскай вобласці фактуры для гэтай рубрыкі больш, чым можна сабе ўявіць. Важна, калі журналісты выдання не проста трымаюць руку на пульсе, але здольныя пранікнуць у глыбінныя працэсы той ці іншай з'явы.

І добра яшчэ, што «Звязда» — пастаянны і вельмі чаканы госць у доме, бо друкуецца амаль кожны дзень. Гэта больш трывала звязвае рэдакцыю з чытачом, дазваляе на старонках газеты друкаваць самыя свежыя навіны.

«Звязда» заўсёды вылучаецца добрай, вытрыманай мовай, трапным беларускім словам. Выдатна, што родная мова такім чынам папулярызуецца ў інтэрнэт-асяродку, бо ў газеты ёсць свой сайт і старонкі ў сетках. Узяўшы на ўзбраенне сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, выданне беражліва захоўвае каштоўнасці традыцыйнай журналістыкі. Прафесіяналізм, павага да чалавека, разуменне вялікай адказнасці за выказанае слова забяспечваюць выданню ўстойлівую і ўдзячную чытацкую аўдыторыю.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Блізкая ўлада

## Кампетэнтныя адказы на хвалюючыя пытанні

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 19 верасня, з 9.00 да 12.00 праводзяць:

— кіраўнік спраў Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;

— кіраўнік спраў Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

— першы намеснік старшыні Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;

— намеснік старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

— кіраўнік спраў Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

— намеснік старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;

— кіраўнік спраў Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# БОЙЦЕСЯ НЕ ГРЫПУ, А ЯГО ЎСКЛАДНЕННЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Колькі будзе доўжыцца вакцынацыя? Да якога часу не позна прышчапіцца?***

— Прышчапіцца можна да снежня. Але чым раней вы зробіце прышчэпку, тым большая верагоднасць, што да пачатку пад'ёму захваральнасці выпрацуецца максімальны цітр антыцелаў. Калі вы не паспелі па нейкіх прычынах прышчапіцца своечасова, гэта можна зрабіць, нават калі вірус грыпу пачынае актыўна цыркуляваць. Але тут ёсць небяспека, што вакцынацыя супадзе з інкубацыйным перыядам хваробы, а гэта не вельмі добра. У любым выпадку, калі не атрымліваецца прышчапіцца падчас кампаніі вакцынацыі, мы рэкамендуем зрабіць гэта пазней.

***— Ранні пачатак кампаніі звязаны з распаўсюджваннем каранавіруснай інфекцыі...***

— Так. Паралельнае распаўсюджванне каранавіруса і віруса грыпу павялічвае небяспеку цяжкіх ускладненняў і, на жаль, цяжкіх зыходаў. Існуе высокая верагоднасць заразіцца адначасова двума вірусамі, улічваючы, што цыркулююць яшчэ і адэнавірусы, і іншыя сезонныя інфекцыі. У чалавека, які перанёс грып, аслаблены імунітэт, і калі ён заразіцца каранавіруснай інфекцыяй, то цяжар хваробы і зыход куды больш сур'ёзныя. Важна, што прышчэпка ад грыпу стварае неспецыфічны імунітэт і да іншых вірусных інфекцый. Таму ў сезон павышэння захваральнасці такі чалавек радзей будзе хварэць на рэспіраторныя хваробы.

> **«Сёння ўвогуле любы чалавек можа бясплатна прышчапіцца гэтай вакцынай. Для гэтага варта прыйсці ў паліклініку па месцы жыхарства. Такі пацыент па-за чаргой пройдзе агляд урача, атрымае допуск і будзе прышчэплены».**

І грып, і каранавірус мае тропнасць да лёгачнай тканкі — і той, і другі вірусы паражаюць не толькі верхнія дыхальныя шляхі, але і хутка апускаюцца ў лёгкія. Таму ў гэтым эпідсезоне ёсць асаблівая неабходнасць прышчапіцца ад грыпу. Вакцын ад каранавіруса ў нас пакуль няма, гэтак жа як і спецыфічных лекаў, таму абавязкова варта абараніць сябе хоць бы ад грыпу.

***— Сярод «антыпрышчэпачнікаў» існуе меркаванне, што прышчэпка аслабляе наш імунітэт, і ў гэты час можна захварэць...***

— Казаць пра тое, што прышчэпка зніжае імунітэт, можа толькі чалавек вельмі далёкі ад імуналогіі. Вакцынацыя садзейнічае выпрацоўцы аховы — спецыфічных і неспецыфічных антыцелаў супраць пэўнай інфекцыі. Узмацняецца і агульны імунны фон. Таму мы рэкамендуем своечасова прышчапляцца не толькі ад грыпу, але і ад іншых інфекцый: слупняку, дыфтэрыі, адру і іншых. Непрышчэпленыя людзі хварэюць цяжка, з дрэннымі зыходамі. А вакцыяваны чалавек, нават калі ён заразіцца (вучоныя даюць ад 10 да 20 % такой верагоднасці), то перахварэе лёгка і без цяжкіх ускладненняў.



www.nikhospital.ru

***— Каму нельга рабіць прышчэпку ад грыпу? Якія да яе ёсць супрацьпаказанні?***

— Сучасныя супрацьгрыпозныя вакцыны, што сёння выкарыстоўваюцца, высокаімунагенныя. Яны фарміруюць добры імунітэт, і пры гэтым нізкарэактагенныя — выклікаюць мінімум пабочных рэакцый і ўскладненняў. Тым не менш, існуюць супрацьпаказанні. Адно з асноўных — алергія на курыны бялок. Усе супрацьгрыпозныя вакцыны вырошчваюцца на курыных эмбрыёнах. Калі чалавек не пераносіць курыныя яйкі і мяса, гэта значыць адразу пасля ўжывання курынага бялку ў яго ўзнікае імунны адказ у выглядзе ацёку Квінке, спазму дыхальных шляхоў, слёзацячэння, у такім выпадку прышчапляцца нельга. Але такіх людзей вельмі мала.

Акрамя таго, у кожнай вакцыне маюцца ў невялікай колькасці пэўныя кампаненты або іх сляды. Напрыклад, у вакцыне «Ваксігрып» маецца нязначная колькасць антыбіётыку неаміцын. І калі менавіта на неаміцын у вас алергія, то не трэба выпрабоўваць лёс і прышчапляцца гэтай вакцынай. Дадзеныя аб саставах вакцын маюцца ў шырокім доступе — у інструкцыях, інтэрнэце, і з гэтай інфармацыяй можна азнаёміцца.

Абсалютным супрацьпаказаннем з'яўляецца і цяжкая рэакцыя, якая была, скажам, калі прышчапляліся летась. У прыватнасці, анафілактычны шок. Гэта сведчыць пра тое, што вы не пераносіце вакцыну ці нейкія яе кампаненты.

Адноснымі супрацьпаказаннямі з'яўляюцца вострыя захворванні ці абвастрэнні хранічных. У такім выпадку ў дадзены момант прышчапляцца не варта, гэта трэба зрабіць праз тры тыдні пасля выздараўлення.

***— Хто сёлета ў першую чаргу атрымае вакцыну?***

— Абавязкова павінны вакцыянавацца асобы з групы рызыкі. Гэта дзеці з шасці месяцаў да трох гадоў і цяжарныя жанчыны, дзеці пасля трох гадоў і дарослыя, у якіх ёсць хранічныя хваробы (маюцца на ўвазе захворванні сэрца, лёгкіх, нырак, печані, абмену рэчываў (у прыватнасці, хворыя на цукровы дыябет), пацыенты з імунадэфіцытамі), пажылыя людзі з 65 гадоў. Акрамя таго, у групу рызыкі ўваходзяць медыцынскія работнікі, а таксама прадстаўнікі тых прафесій, якія кантактуюць з вялікай колькасцю людзей: педагогі, выхавацелі, таксама супрацоўнікі МУС, МНС; людзі, якія знаходзяцца ў закрытых калектывах. Для таго каб сфарміраваўся калектыўны імунітэт, пажадана, каб было прышчэплена з групы рызыкі — 75 % і 40 % — усяго насельніцтва.

***— Ці даводзіцца пераконваць у неабходнасці вакцынацыі пажылых людзей?***

— Кожны ўрач агульнай практыкі ведае, якая ў яго на ўчастку група рызыкі, у тым ліку пажылых асоб за 65 гадоў. Як правіла, сталыя людзі без праблем прыходзяць і прышчапляюцца. Тым больш што прышчэпка расійскай вакцынай «Грыпол плюс» бясплатная. Сёння ўвогуле любы чалавек можа бясплатна прышчапіцца гэтай вакцынай. Для гэтага варта прыйсці ў паліклініку па месцы жыхарства. Такі пацыент па-за чаргой пройдзе агляд урача, атрымае допуск і будзе прышчэплены.

***— Прышчэпка не дае 100 % гарантыі, што ты не захварэеш на грып?***

— Так. Але баяцца варта не самога грыпу, а яго цяжкіх ускладненняў. Адно з найбольш распаўсюджаных — пнеўманія, ад якой, на жаль, штогод ва ўсім свеце гінуць людзі. Акрамя таго, грып можа даваць такія цяжкія ўскладненні, як міякардзіт, менінгіт і іншыя. Таму прышчэплены чалавек абаронены найперш ад гэтых ускладненняў.

***— Якія могуць быць рэакцыі на прышчэпку?***

— Пры вакцынацыі ад грыпу цяжкіх рэакцый амаль не бывае. Яны пераважна мясцовыя: можа назірацца хваравітасць у месцы ўколу, сверб, пачырваненне, ацёчнасць. Гэта сведчыць, што арганізм зрэагаваў і пачынае выпрацоўваць імунітэт. Акрамя таго, у невялікай колькасці людзей можа быць агульная рэакцыя: нязначнае павышэнне тэмпературы і лёгкае недамаганне — галаўны боль, страта апетыту, пачуццё разбітасці. Але гэта не грып. Пры вакцынацыі немагчыма ім захварэць, бо ў вакцыне няма жывога віруса, а толькі яго часткі, унутраныя і знешнія абалонкі, якія не могуць выклікаць захворванне, але запускаюць выпрацоўку імунітэту.

> **«Паралельнае распаўсюджванне каранавіруса і віруса грыпу павялічвае небяспеку цяжкіх ускладненняў і, на жаль, цяжкіх зыходаў. Існуе высокая верагоднасць заразіцца адначасова двума вірусамі, улічваючы што цыркулююць яшчэ і адэнавірусы, і іншыя сезонныя інфекцыі».**

***— Ці вывучалася ў нас эфектыўнасць вакцынацыі?***

— Імунізацыя вельмі эфектыўная ў эканамічным плане. Ёсць даследаванне, якое паказала, што эканамічны эфект прымянення супрацьгрыпознай вакцыны ў 10-20 разоў перавышае затраты на вакцынацыю. У выніку комплекснай работы па імунізацыі захваральнасць на грып насельніцтва Мінска з 2003 па 2019 год знізілася ў 2,4 раза. Гэта захаваныя здароўе і жыцці людзей, эканамічны эфект, адсутнасць працастрат. У свеце ўжо паўстагоддзя вакцынуюць ад грыпу.

***— Як за гэты час змянілася вакцына?***

— Раней вакцына была жывая, яе капалі ў нос. Яна была высокаімунагенная, а разам з тым і высокарэактагенная. Папросту кажучы, чалавек пасля яе хварэў на грып у лёгкай форме. Да такой вакцынацыі было больш супрацьпаказанняў. Сёння, калі істотных адмоўных момантаў няма, а вакцына працуе выключна на стварэнне імунітэту, прышчапляцца можна бязбоязна, у тым ліку дзецям з шасці месяцаў і цяжарным жанчынам, пачынаючы з другога трыместра.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ЗАПОЎНІЦЬ АНКЕТУ АБ СТАНЕ ЗДАРОЎЯ

**Гэта трэба будзе зрабіць пасажырам — тым, якія вылятаюць у Мінск, паведамілі ў Міністэрстве транспарту і камунікацый.**

«Звяртаем вашу ўвагу, што цяпер пасажыры, канчатковай кропкай падарожжа якіх з'яўляецца Мінск, павінны запоўніць «Самадэкларацыю пасажыра аб стане здароўя ў сувязі з COVID-19 для мэт аховы здароўя».

Што датычыцца авіякампаніі «Белавія», запоўніць анкету можна, папярэдне запампаваўшы форму на сайце belavia.by ў раздзеле «COVID-19. Інфармацыя для пасажыраў», а таксама на борце самалёта падчас палёту.

«Белавія» рэкамендуе паклапаціцца аб запаўненні анкеты да вылету для памяншэння колькасці кантактаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Вакцынацыя

## УВАГА ДА ПРЫШЧЭПАК

**Галоўны санітарны ўрач Брэста Генадзь РАДЧАНКА паведаміў, што ў горадзе пачалася вакцынацыя супраць грыпу. Пра выключную важнасць кампаніі нагадаў у сваім тэлеграм-канале старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.**

Ва ўстановы аховы здароўя паступіла звыш 24 тысяч доз вакцыны. Гэта прэпарат «Грыпол-плюс». Ён зроблены ў Расіі і набываецца за кошт рэспубліканскага бюджэту. Генадзь Радчанка адзначыў, што ў першую чаргу будуць прывіваць дзяцей, людзей з хранічнымі захворваннямі, пенсіянераў ва ўзросце 65+. Затым настане чарга школьнікаў і студэнтаў, а таксама іх педагогаў, для іх верагоднасць заражэння грыпам традыцыйна з'яўляецца высокай. Усе гэтыя катэгорыі людзей будуць прышчэплены бясплатна.

Сёлета ў Брэсцкай вобласці плануецца прышчапіць больш за 540 тысяч чалавек, а гэта каля 40 працэнтаў насельніцтва. Як адзначыла **загадчык аддзела эпідэміялогіі Брэсцкага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Марына ШЫЛОВІЧ**, летась у рэгіёне амаль не рэгістравалася захваральнасць грыпам, таму сёлета спецыялісты прагназуюць яго актывізацыю. А на фоне таго, што каранавірусы працягваюць цыркуляваць і людзі па-ранейшаму заражаюцца імі, важна максімальна знізіць рызыку хваробы на грып.

У канцы рабочага дня ў Цэнтральнай паліклініцы Брэста каля працэдурнага кабінета чакалі прышчэпкі некалькі пенсіянераў. Марына Васілюк падкрэсліла, што да ўласнага здароўя ставіцца ўважліва, таму кожны год робіць прышчэпку ад грыпу. Расійскай вакцыне яна давярае, не раз выкарыстоўвала такі прэпарат у якасці прафілактыкі і вынікам заставалася задаволеная.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

17 ВЕРАСНЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 17 (15894)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

## Маргарыта ЛАТЫШКЕВІЧ:

# «Люблю марыць, а часам і падурэць»

**Яна — паэтка, пісьменніца, даследчыца, фалькларыстка, аўтарка шэрагу кніг («Яблыкі», «Наш дом», «Там, дзе сэрца»), а да таго ж лаўрэатка Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Але гэта ўсё фармальнасці, бо ў яе творах вы акунаецеся ў магію і шчырасць у розных формах, жанрах і відах. Дзе шукаць беларускую міфалогію, як выйсці за межы кнігі, расказала суразмоўніца.**



***— У часопісе «Бярозка» вы ведзяце цыкл літаратурных майстар-класаў. Напрыклад, «Як напісаць раман за пяць крокаў». Існуюць універсальныя схемы, каб напісацьварты твор?***

— Так, «бярозкаўцы», якіх шчыра люблю як сяброў і творцаў, прапанавалі паўдзельнічаць у іх «майстар-класным» праекце, куды яны прыцягваюць больш-менш спрактыкаваных аўтараў часопіса. На той момант я якраз закончыла свой першы вялікі (праўда вялікі — 1,5 мільёна знакаў) раман і займела сякі-такі вопыт. Ясна, што ўніверсальнай схемы, якая пасавала б усім і кожнаму, няма, і гэта, уласна, і даводжу ў першай публікацыі з серыі. Але падказаць, як структураваць свой час, як аперыраваць словам і складнікамі мастацкага свету, — гэта, на маю думку, цалкам магчыма. А яшчэ трэба працаваць. Шмат. Без гэтага ніяк.

***— У вашых творах шмат адсылак да міфалогіі і казак. Як вы збіраеце чароўныя вобразы і матывы?***

— Увогуле, па спецыяльнасці я фалькларыст, даследчык. Пэўны час працавала ў Вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору ў БДУ (дарэчы, адзінай такой у краіне). А міфалогіяй цікаўлюся з маленства — хоць хто ў свой час не зачытваўся пераказам старажытнагрэчаскіх міфаў ад Мікалая Куна. Беларускую ж міфалогію люблю шчырай і трапяткой любоўю. Напэўна, дзякуючы Баршчэўскаму і Караткевічу. Ну і, канешне, дзякуючы беларускім казкам, якія таксама любіла чытаць у маленстве. Што да літаратуры, дык заўжды згадваю як прыклад адзін выпадак. Студэнткаю другога курса напісала артыкул пра вобраз Кашчэя Бессмяротнага ў беларускіх казках (параўноўваючы яго з Ватанам-Одзінам са скандынаўскай міфалогіі). А праз дзесяць гадоў назапашаныя веды «пераварыліся» ўжо ў творчую інтэрпрэтацыю вобраза — у аповесці фэнтэзі. Неяк так яно працуе, мусіць.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

На адрэналіне

# УТАЙМАВАЛЬНІКІ АГНЮ

## І яны ж — сапраўдныя артысты!

**Аб тым, што такое фаер-шоу, у наш час ведае, напэўна, кожны. Гэта маляўнічае, эмацыянальнае і па-сапраўднаму небяспечнае прадстаўленне. Шоу, у якім артысты гуляюць з агнём у прамым сэнсе слова. Для кагосьці адважныя выступоўцы, што прыручылі стыхію, здаюцца сапраўднымі героямі, а некаторыя лічаць іх вар'ятамі. Хто ж яны: артысты ці экстрэмалы? На гэтае і іншыя пытанні нам адказаў кіраўнік мінскага тэатра агню «Flamen» Дзмітрый ПЯТРОВІЧ.**



Марта Разумейчык.

— З гэтым экстрэмальным відам мастацтва я пазнаёміўся даўно і зусім выпадкова. Аднойчы, гуляючы па вуліцы, сустрэў фаершчыкаў, яны па-майстэрску спраўляліся з агнём. Іх трукі мяне проста скарылі, я вырашыў пагутарыць з імі і пазнаёміўся бліжэй. У выніку, убачыўшы, што мяне гэта справа зацікавіла, хлопцы прапанавалі пазаймацца з імі і павучыцца. Спачатку не аддаваў новаму захапленню шмат увагі — для мяне тое было проста хобі, але потым зацягнула, і ў выніку я стаў прафесіяналам у гэтай сферы.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Свая справа

# «РАСЛІНЫ — ГЭТА МАЁ ЖЫЦЦЁ»,

## або Калі прачнуўся — і адразу ў сад

**Васямнаццацігадовы Кірыл ВАЎРАНЮК з Брэста з самага дзяцінства займаецца вырошчваннем раслін. У калекцыі хлопца іх больш за тысячу, а то і дзве. Ён выводзіць і ўласныя сарты — летась у снежні афіцыйна зарэгістраваў першы, назваў яго сваім імем — лілейнік «Кветка Кірыла». Працаваў над ім юнак шэсць гадоў!**



— Летась я скончыў школу і хацеў паступаць на агранома, каб навучыцца выводзіць сарты раслін на прафесійным узроўні і мець больш ведаў па іх развядзенні. Але аказалася, што ў родным горадзе такой прафесіі не вучаць, а пакідаць надоўга свой сад не хацелася, таму пайшоў у Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт на спецыяльнасць «Меліярацыя і водная гаспадарка». Па ёй працаваць не збіраюся, але атрыманы досвед лішнім дакладна не будзе.

Свае першыя хатнія расліны Кірыл пачаў вырошчваць яшчэ з сямі-васьмі гадоў.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
17 09 2020 г.

Свой выбор

# «ІМКНУСЯ ДАПАМАГЧЫ ЎСЮДЫ І ЎСІМ»

## Малады ўрач лічыць, што самае галоўнае — добра і адказна працаваць

**Дваццаціпяцігадовая Ганна ЦІКАВЕНКА — малады спецыяліст-медык з Гомеля, якая два гады таму прыехала ў гарадскі пасёлак Акцябрскі па размеркаванні. Цяпер яна працуе намеснікам галоўнага ўрача цэнтральнай раённай бальніцы. Як адчувае сябе на такой пасадзе і з чаго складаюцца будні ўрача? Пра гэта мы дазналіся ў суразмоўніцы.**



— Да дзясятага класа я хацела быць журналістам. Марыла пісаць цікавыя інтэрв'ю, быць тэле- або радыёвядучай, але праз некаторы час зразумела, што мне больш падыходзіць прафесія ўрача. Таму паступіла ў Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт на спецыяльнасць «Агульная медыцынская практыка». Вучоба там была для мяне, як і для многіх студэнтаў, нялёгкай. З першага да чацвёртага курса штодзень з раніцы да позняга вечара аддавала вялікую ўвагу навучанню, з пятага да шостага было ўжо прасцей, аднак бяссонных начэй усё роўна хапала. Я была старанная студэнтка, не прапускала пары, тым больш адпрацоўкі былі платныя. Хоць і да пераздач ставілася спакойна.

Практыкі Ганна праходзіла ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека, у гомельскіх гарадскіх клінічных бальніцах № 2 і № 3, інтэрнатуру — у гомельскай гарадской клінічнай бальніцы № 1.

— Кожны з пералічаных вопытаў — своеасаблівы, непадобны да іншых. Пасля трэцяга курса падчас медыцынскай практыкі трэба было рабіць ін'екцыі, перавязкі, ставіць кропельніцы і іншае. Пасля чацвёртага і пятага я ўжо практыкавалася ў аддзяленні акушэрства і гінекалогіі, прысутнічала на родах, глядзела, як робяць гінекалагічныя аперацыі. Гэта ўразіла і вельмі спадабалася. На шостым курсе ў нас праходзіла папярэдняе размеркаванне. Там вырашылі, што па мэтавым накіраванні паеду ў Акцябрскі раён. Я ведала пра гэты пасёлак, але ніколі ў ім не была.

Дзяўчына прызнаецца, што з нецярплівасцю чакала першых рабочых дзён на новым месцы...

— Перад прыездам даведалася, што буду займаць пасаду загадчыцы амбулаторыі ў вёсцы Парэчча. Мне далі дом і наступныя паўгода я правяла там. Памятаю, што спачатку адразу спытала ў калегі, які чакаецца паток пацыентаў, мне адказалі, што зусім невялікі. Але на прыём прыходзілі па 20—30 чалавек за змену. Да таго ж, на ўчастку я абслугоўвала і бальніцу сястрынскага догляду, таму ў цэлым атрымлівалася каля 40 пацыентаў штодня. Але для мяне як для маладога спецыяліста ўсё было ў навінку, такі досвед лічу вельмі карысным і цікавым.

У лютым Ганну перавялі ў Акцябрскую ЦРБ:

— Ува мне ўбачылі патэнцыял і прапанавалі кіраўніцкую пасаду, я не думаючы пагадзілася, бо любы вопыт — гэта развіццё. Была ўпэўнена, што калектыў паставіцца да мяне добра. Вельмі падабаецца, што магу сумяшчаць і лячэбную практыку, і кіраўніцкую дзейнасць. Я ўрач агульнай практыкі, таму, калі патрабуецца, замяняю калег і праводжу прыёмы, калі яны ў адпачынку або на бальнічным, — увогуле, імкнуся дапамагчы ўсюды і ўсім. На рабоце я не строгая са сваімі пацыентамі, хоць спачатку хацелася такой быць, маўляў, пасада ж,



трэба ёй адпавядаць. Аднак лічу, што лепш заставацца сабой. Рабочы дзень у мяне доўжыцца прыкладна з 9 да 17 гадзін, але, бывае, тэлефануюць калегі або пацыенты па-за рабочым часам: і познім вечарам, і ў выхадныя дні, каб пракансультавацца або разабраць пэўны клінічны выпадак.

Ганна прызнаецца, што падчас работы часам яе здзіўляе безадказнае стаўленне да саміх сябе ў пацыентаў.

— На жаль, гэта не рэдкасць. Урач робіць усё магчымае, каб звярнуць увагу на пэўную праблему са здароўем і дапамагчы, аднак пацыент ці то з-за страху, ці то з-за недахопу часу або жадання не хоча прызнаваць і выпраўляць яе. Таксама бываюць нетыповыя клінічныя выпадкі, з якімі я ніколі не сутыкалася. Тады звяртаюся або да галоўнага ўрача, або да старшай медсястры, і больш дасведчаныя калегі заўсёды дапамагаюць. Увогуле на негатыў або стрэсавыя сітуацыі рэагую спакойна.

Дарэчы, бальніца часта прапануе дадатковае навучанне. Да таго ж, заўсёды можна праходзіць розныя вэбінары, анлайн-курсы.

Дзяўчына кажа, што хоць работа і займае ў яе шмат часу, на сябе хвіліны таксама ёсць. «Часцей за ўсё на выхадных выязджаю ў родны Гомель ці Мінск, у Акцябрскім раёне арганізоўваю толькі хатнія вячоркі з сябрамі. Шчыра кажучы, пакуль мне ўсё падабаецца, нават не супраць у далейшым тут застацца жыць. Задавальняе і пасёлак, і месца працы. Тым больш, якая розніца, дзе знаходзіцца, галоўнае — адказна працаваць і прыносіць карысць іншым.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва суразмоўніцы.**



Дзмітрый Пятровіч.

# УТАЙМАВАЛЬНІКІ АГНЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

З часам наш герой зразумеў, што яго жаданні і магчымасці сталі выходзіць за рамкі аднаго артыста і што ён хоча не проста быць часткай нейкага калектыву, а ствараць свой — літаральна з нуля. На шчасце, побач знаходзіліся тыя, хто падтрымаў ініцыятыву Дзмітрыя. Цяпер у яго камандзе сем артыстаў асноўнага складу, аднак колькасць можа павялічвацца ў залежнасці ад сезона.

— Пры наборы «навабранцаў» у шарагі фаершчыкаў я звяртаю ўвагу на многія фактары. Першае — вядома ж, наяўнасць артыстызму, бо для мяне «ўтаймавальнік агню» — найперш артыст. Ён дорыць людзям шоу, зачароўвае іх, таму харызма лішняй дакладна не будзе. Акрамя таго, чалавек, які ўступіў у гэтую справу, павінен быць творчы і крэатыўны. Абсалютна ўсе нумары мы прыдумляем самастойна, і, акрамя элементаў фаер-шоу, закранаем харэаграфію і тэатральнае мастацтва, а таксама падбіраем музыку і прадумваем уласныя вобразы. Ну і, вядома ж, у нашых артыстаў проста абавязана быць «галава на плячах» і адказнасць. Бо мы круцім не праекцыяй, а сапраўдным агнём, які можа нанесці сур'ёзныя траўмы. Што датычыцца ўзросту і фізічнай падрыхтоўкі, то гэта абсалютна індывідуальна. Але я раіў бы пачынаць не раней за васямнаццаць гадоў.

У арсенале ў «вогненных» артыстаў, акрамя трукаў, маецца яшчэ мноства атрыбутаў, што выкарыстоўваюцца падчас трэніровак і выступленняў. Інвентар разнастайны, самае папулярнае — гэта паі, папросту кажучы — мячыкі на ланцугах. Акрамя гэтага, часта выкарыстоўваецца ланцуг, на якім стаіць кнот, прамочаны гаручай сумессю, ён называецца роўп-дарт. Ёсць яшчэ вееры, палмы, даблстаф, каметы, кубы і многае іншае. З усімі вышэйпералічанымі штукамі фаершчыкі ствараюць акрабатычныя, харэаграфічныя, тэатралізаваныя нумары. А вось адзін з самых папулярных трукаў сярод гледачоў — выдзіманне агню — Дзмітрый і яго каманда не выконваюць, нягледзячы на ўсю яго эфектнасць. Ён лічыць яго самым небяспечным і рызыкоўным сярод усіх астатніх, бо нават пры захаванні тэхнікі бяспекі могуць адбыцца неспадзяванкі.

— Наогул, захаванне тэхнікі бяспекі ў фаершчыкаў з'яўляецца прыярытэтным заняткам. Не варта забываць аб тым, што агонь усё-такі не цацка, як бы банальна гэта ні гучала, а стыхія, непадуладная чалавеку, і далёка не заўсёды яна паддаецца кантролю па нашым жаданні. На шчасце, ні ў мяне, ні ў маёй каманды сур'ёзных траўмаў не было, а ўсё таму, што пачаткоўцы праходзяць строгі інструктаж і падрыхтоўку. Пачынаць займацца «навабранцам» трэба абавязкова з трэніровачнага рэквізіту і пад наглядам вопытных артыстаў. Першыя крокі з агнём яны змогуць зрабіць ужо праз некалькі месяцаў, а праз паўгода — паспрабаваць сябе ў ролі артыста. Зрэшты, па тэрмінах усё індывідуальна, у таленавітых навучэнцаў усе гэтыя этапы могуць праходзіць хутчэй. У любым выпадку трэба абавязкова запасціся цярпеннем, стараннасцю і жаданнем працаваць над сабой.

У прафесіі артыста вогненнага тэатра, як і ў любой іншай, ёсць свае плюсы і мінусы. У ходзе нашай гутаркі Дзмітрый не раз падкрэсліваў вартасці гэтай працы, напрыклад, незвычайнасць, магчымасць творчага развіцця і крэатыўнага мыслення, новыя знаёмствы з цікавымі людзьмі і, вядома ж, адрэналін, які атрымліваеш вялізнымі дозамі пасля кожнага выступлення. А вось над недахопамі наш суразмоўнік думаў вельмі доўга.



Яўгенія Маджарава.

— Мінусам можна назваць хіба што пастаянную занятасць у выхадныя і святы. Хоць з іншага боку, наша работа — гэта і ёсць пастаяннае свята! На мерапрыемствах, дзе мы выступаем, не атрымліваецца сумаваць, так што ў стане апошняга мы знаходзімся пастаянна. Фаершчыкаў нельга параўнаць з людзьмі, якія працуюць у офісе, наш занятак неверагодна цікавы і творчы. Мы не сядзім на месцы з-за раз'ездаў, пастаянна прыдумляем і спрабуем нешта новае і захапляльнае. Таму атрымліваецца, што ў маёй прафесіі для мяне няма недахопаў! *(Смяецца).*

У звычайны час Дзмітрый са сваёй камандай часта гастралююць па прасторах нашай краіны, таксама выязджаюць за мяжу дзяліцца з калегамі сваім вопытам. У творчым адпачынку, які здарыўся з-за напружанай эпідэміялагічнай сітуацыі, ён прыдумляе і прапрацоўвае з калектывам усё больш новых і цікавых трукаў і нумароў, каб потым з новай сілай скараць сэрцы сваіх гледачоў магіяй агню.

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**студэнтка IV курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**
**Фота дадзены суразмоўнікам.**

# «РАСЛІНЫ — ГЭТА МАЁ ЖЫЦЦЁ»...



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Тады мы з бацькамі жылі ў кватэры. Памятаю, што калі выходзілі на прагулкі, замест цукерак і цацак, як астатнія дзеці, я выпрошваў прыгожыя кветкі і ўгнаенні. Мне было цікава, як з'яўляюцца новыя парасткі, лісцікі. Аднойчы мы з бацькам прыйшлі на рынак, дзе гандлявалі цюльпанамі і крокусамі. Убачыў іх — і быццам закахаўся. Я пра іх наогул нічога не ведаў, навыкі прыйшлі праз эксперыменты. Зразумела, рабіў шмат памылак. Але ніколі не здаваўся, заўсёды спрабаваў розныя варыянты вырошчвання, каб атрымаць тое, што хачу. Раскажу выпадак, які звязаны з вінаградам. Калі мы толькі пераехалі ў прыватны дом восем гадоў таму, я пайшоў на рынак па кусты найсмачнейшы вінаград. Узяў адразу некалькі сартоў саджанцаў. Не ведаў, як іх трэба вырошчваць, мне ніхто не расказаў пра гэта і не параіў. Натхнёны, прыбег дадому, высадзіў іх, а калі пайшлі замаразкі — яны вымерзлі, бо саджанцы былі падрошчаны ў цяпліцы. Зразумеў, што так нельга. Потым яны захварэлі, значыць, трэба было апрацоўваць спецыяльнымі рэчывамі, падумаў я... І так давядаўся аб усіх раслінах.

Кірыл адразу папярэджвае: да многіх з іх спачатку трэба доўга шукаць падыход.

— Напрыклад, калі пасадзіў самыя першыя павойнікі (клематысы) (зараз у калекцыі Кірыла 40 сартоў. — **Аўт.**), яны не хацелі «сябраваць» з маёй зямлёй. У мяне яна кіслая, а кветкі да такой не прывыклі. Калі зразумеў, у чым праблема, раскісліў яе, але патрэбнага эфекту не ўбачыў. І толькі калі падкарміў расліну арганікай, яна зацвіла. Іншымі словамі, я заўсёды эксперыментую, нават калі на гэта сыходзяць гады. У канчатковым выніку ўсё атрымліваецца.

Кірыл вырошчвае расліны ва ўласным садзе. Там пакуль яшчэ многа месца, таму папаўняць калекцыі можна доўга.

— Амаль увесь вольны ад вучобы час займаюся гэтай справай, бо вельмі яе люблю. Колькі ў мяне раслін, і сам не ведаю, ужо збіўся з ліку. Напрыклад, аднаго толькі лілейніка больш за 60 сартоў, вінаграду — больш за 40, клематысаў таксама столькі ж. Але спачатку мой участак быў пусты, трэба было дзесьці ўзяць новыя расліны. Грошы на іх у бацькоў браць не хацеў, таму пачаў разводзіць хатнія кветкі, якіх на той момант у нас было шмат. Да таго ж пачаў прадаваць саджанцы на рынку. Кожны год колькасць раслін павялічвалася, таму ўжо праз тры гады я ўзяў сабе пастаянны абанемент і гандляваў штодзень. Бывалі дні, калі наогул нічога не зарабляў. Заплаціў за месца — і паехаў дадому з пустымі кішэнямі. Але быў вялікі азарт і жаданне зарабіць на новыя расліны. Памятаю, раней калі хто-небудзь купляў у мяне кветкі, многія нават не слухалі, што я ім казаў, што раіў, — не ўспрымалі юнака ўсур'ёз. Цяпер зусім па-іншаму. Многія мяне ведаюць, ёсць пастаянныя кліенты.



Дарэчы, цэны ў мяне невысокія — два-пяць рублёў за штуку.

Суразмоўнік кажа, што галоўная мэта для яго — не прадаць як мага больш раслін, а натхніць іншых любіць іх.

— Сваім пакупнікам заўсёды раблю падарункі, дзецям — асабліва. Дарэчы, падыходзяць да мяне не толькі пенсіянеры. Многа маладых пар, у якіх ёсць дом або дача. Часта бывае так: зацікавіліся маімі саджанцамі некалькі чалавек, распытваюць пра іх нешта, я вельмі гучна і эмацыянальна пачынаю расказваць (па-іншаму не магу), і хтосьці таксама падцягваецца да нас. У выніку маю шмат пакупнікоў, чаму я, вядома ж, рады. Хоць іншыя прадаўцы часта абураюцца з-за гэтага. Сёлета праз пандэмію і вучобу бываю на рынку не так часта, як раней, але ў далейшым абавязкова выпраўлюся.



Кірыл падзяліўся, што звычайна ён прачынаецца а пятай гадзіне раніцы, — і адразу ў сад: палiваць, расаджваць, чаранкаваць, палоць... І так да позняга вечара.

— Самая любімая расліна тая, якую сам вывеў. Афіцыйны працэс рэгістрацыі сорта — гэта апісанне яго на пяці аркушах дробным шрыфтам з двух бакоў. Я ўсё рабіў анлайн праз маскоўскі цэнтр. Але калі сур'ёзна, усе расліны любімыя, кожная індывідуальная і прыгожая. І за ўсімі, нават за травой, патрэбны пастаянны догляд. Адна з самых непатрабавальных раслін, якія цвітуць доўга, — лілейнікі, іх яшчэ называюць «кветкай лянівага інтэлігента». Пра іх кажуць: пасадзіў і забыўся. А самае лепшае ўгнаенне для іх — гэта вільгаць. Чым больш паліваеш гэтую кветку, тым прыгажэйшая яна будзе ў выніку. Алісум таксама вельмі прыгожа цвіце, ён увесь абсыпаны маленькімі кветачкамі. Да таго ж, прыемна пахне мёдам і вельмі холадаўстойлівы. Яшчэ адзін варыянт непераборлівай расліны — ільвіны зеў. Стаіць доўга і прыгожа, цвіце ўсё лета.

**«Аднойчы мы з бацькам прыйшлі на рынак, дзе гандлявалі цюльпанамі і крокусамі. Убачыў іх — і быццам закахаўся».**

Сёлета Кірыл упершыню высадзіў малюцэлу або ірландскія званочкі.

— Кветкі ў яго зялёнага колеру — як і лісцікі. Гэта незвычайная расліна: калі яе пацерці, можна пачуць моцны пах лайма. Расліна холадаўстойлівая. А вось азалею трэба высаджваць тым, у каго ёсць халоднае памяшканне. Калі паставіць яе на падаконнік, куды свеціць сонца, яна адразу ж засохне. Затое ў добра асветленым халаднаватым месцы будзе радаваць цвіценнем да двух месяцаў. Дарэчы, расліны для сябе выбіраю не тыя, якія найчасцей мільгаюць на фотаздымках у сацсетках, — не арыентуюся на трэнды, заўсёды купляю ў першую чаргу тое, што мне сапраўды падабаецца. Зразумела, зараз шмат часу аддаю вучобе, таму дапаўняю калекцыі раслін не так часта. А вось летась, напрыклад, набыў сабе не менш за 300 розных новых сартоў.

Але калі ўсё ж такі казаць пра трэнды на расліны, Кірыл накіроўвае: зараз у попыце гартэнзіі.

— Ёсць шмат яе відаў: чаранковая, дрэвападобная, прамяністая, мяцёлчатая. Яны ўсе розныя. Напрыклад, мяцёлчатая — ружовага колеру, зімуе добра, буйналістую ружовую многія хочуць, але не ўсе рызыкуюць вырошчваць, таму што яе на зіму трэба накрываць. Але ў мяне, напрыклад, толькі ў садзе 20 сартоў буйналістай гартэнзіі, мяцёлчатай — 19, іншыя віды таксама ёсць. Увогуле, я вельмі хацеў бы высадзіць незвычайную кветку таку — яна падобная на кажана, яе яшчэ называюць кветкай д'ябла. Гэтая расліна прыносіць вялікую карысць людзям. Маладое лісце і суквецці, а таксама мякаць яе пладоў жыхары Афрыкі і Паўднёва-Усходняй Азіі ядуць. У каранях утрымліваецца вялікая колькасць крухмалу, які таксама выкарыстоўваюць у ежу. З каранёў робяць муку для выпечкі хлеба, гатуюць прысмакі і лекі, а са сцёблаў — капелюшы і рыбацкія прылады. Калі казаць пра маю мэту ў жыцці, то яна пастаўлена — стварыць уласны парк з раслінамі тых сартоў, якія я самастойна вывеў. Вядома, ажыццяўлю гэта не сёлета, а праз гадоў дзесяць.

Суразмоўнік прыгадаў, што як толькі пачаў займацца раслінамі, многія не разумелі яго і нават здзекаваліся. Казалі: як хлопец можа займацца такой справай? Яна ж не мужчынская!

— Так, раней сутыкаўся з негатывам у свой бок. У дзяцінстве прафесійна займаўся водным пола. Памятаю, калі ездзілі на спаборніцтвы, усе хлопцы ішлі ў краму па чыпсы ці ваду, а я — па новыя расліны. Каманда смяялася, але зараз яны думаюць пра мяне па-іншаму. Я на іх не крыўдую. Увогуле навучыўся прапускаць негатыў міма вушэй. У кожнага чалавека ёсць сваё меркаванне. Але я не прывык камусьці паказваць на недахопы або крытыкаваць, думаю, гэта нікому не падабаецца. Дарэчы, цяпер нават ва ўніверсітэце чую добрыя словы, многія знаходзяць мяне ў сацсетках і захапляюцца тым, што раблю, маім садам, — гэта прыемна.

Кірыл актыўна вядзе старонкі ў Tik-Tok і Instagram. На першай у хлопца больш за 100 тысяч падпісчыкаў і каля 700—800 тысяч праглядаў пад кожным відэа. На другой — амаль 30 тысяч падпісчыкаў. Кірыл шчыра кажа, што самая галоўная мэта для яго ў віртуальным свеце — натхняць іншых.

— У Instagram публікую ў большасці фота-кантэнт, у Tik-Tok — кароткія відэа. Зарэгістравацца ў апошнім параіў мой сябар, сказаў, што там цяпер сядзіць уся моладзь і мне абавязкова варта паспрабаваць. Я зацікавіўся і стварыў профіль у маі бягучага года. Адно з першых відэа было пра тое, як зрабіць маску з кветак. Гэта быў перыяд каранціну падчас пандэміі, і мне хацелася неяк разрадзіць абстаноўку. Запісаў працэс, ён спадабаўся карыстальнікам сацсеткі, і мой профіль адразу адправілі ў рэкамендацыі. На тым відэа цяпер амаль мільён праглядаў. Пасля з'явілася больш натхнення, якое не пакідае дагэтуль. Я не саромеюся нічога паказваць, у тым ліку і тое, які я ёсць. Ніколі не ставіў мэты распіярыцца, праславіцца. Часам пішуць, што, дзякуючы мне, хтосьці пачаў займацца развядзеннем раслін, некаторыя просяць саджанцы для таго, каб вырасціць нешта самастойна. Садоўнікі-пачаткоўцы звяртаюцца да мяне па парады, — я дзялюся карыснымі інсайтамі. Мне здаецца, сакрэт папулярнасці ў гэтым: я знайшоў тое, чым жыву, і паказваю гэта захапленне іншым. За любым чалавекам, які цалкам пагружаны ў сваю справу, цікава назіраць.

**«Я заўсёды эксперыментую, нават калі на гэта сыходзяць гады. У канчатковым выніку ўсё атрымліваецца».**

Суразмоўнік паспявае і музычныя альбомы запісваць. Пра што? Зразумела, пра кветкі!

— Песні пішу сам, некалькі гадоў таму купіў фартэпіяна, вось і практыкуюся. На прагулкі з сябрамі часу амаль няма, да таго ж, усё роўна цягне да свайго саду. Ёсць у мяне яшчэ адно хобі, якое вельмі падабаецца, — мадэлінг. Шматлікія агенцтвы прапаноўваюць кантракты, і мне гэта цікава, аднак пакуль што не атрымліваецца выдзяляць гэтаму шмат часу. Часта іншыя здзіўляюцца, што на мадэльных фота я такі сур'ёзны, «у вобразе», а ў жыцці і на сваіх звычайных здымках без усмешкі не абыходжуся.

Кірыл дае парады тым, хто таксама хоча развівацца ў гэтым кірунку: трэба знайсці добрага настаўніка і не баяцца эксперыментаваць.

— Расліны — гэта маё жыццё. Паспяваць усюды дапамагае азарт. Аднак варта ведаць, што проста прачытаць нейкія артыкулы ў інтэрнэце — мала. У любой справе важна знайсці чалавека, які валодае дакладнай інфармацыяй і зможа расказаць, што і як правільна рабіць. Бо, напрыклад, у Беларусі і ва Украіне зямля зусім розная, нават у межах нашай краіны яна адрозніваецца. Таму парады ад аўтара-іншаземца нам не падыдуць. Розныя кліматычныя зоны — адпаведныя прынцыпы вырошчвання раслін. І, галоўнае, мець жаданне: калі яно будзе, добры вынік абавязкова ўбачыце.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота дадзены суразмоўнікам.**

SEX-БАЛЯСЫ

# ЗАМУЖ — НЕВЫНОСНА!

**У Расіі зараз шлюбны бум: пасля каравіруса гэты рынак рэзка ажывае. («Каранцін скончаны. Загсы завалены заявамі на развод».) Сёлетняй вясной прыкладна траціна пар у гэтай краіне вырашылі адкласці заключэнне шлюбу праз пандэмію. («Для тых, чые вяселлі перанесены з-за эпідэміі: Бог даў вам шанц... Спыніцеся!») Пасля адмены каранціну нявесты кінуліся набываць белыя сукенкі. Попыт на іх толькі за ліпень павялічыўся на 36 працэнтаў у параўнанні з чэрвенем. А ў адносінах да мінулага года — і ўвогуле ў паўтара раза. («Аб'ява ў газеце ў графе знаёмстваў: «Мужчыны, прыгожага, багатага, без праблем з жыллём, без шкодных звычак і ранейшых жонак хочацца проста ўбачыць».) Канешне, часткова гэта тлумачыцца адкладзеным попытам, калі сёлета з сакавіка да чэрвеня праз пандэмію нельга было праводзіць святы, і таму ў ліпені адбыўся заканамерны ўсплёск на «шлюбным фронце». Таксама эксперты адзначаюць, што самаізаляцыя — не адзіная прычына такой сітуацыі («— Як змагаліся вашы бацькі з самотай, калі яшчэ не было інтэрнэту? — Не ведаю, я задаў гэтае пытанне сваім пяцярым братам, і яны таксама не ведаюць».) Проста многія пары першапачаткова аддаюць перавагу правядзенню свята менавіта летам.**

Разам з тым, па даных брытанскай праграмы па планаванні шлюбаў Bridebook, прыкладна 64 працэнты шлюбных цырымоній у свеце ў 2020 годзе будуць або адменены, або перанесены з-за каранавіруса на наступны год. («— Мамачка, Глеб сказаў, што я цудоўная дзяўчына. Можна, я яго ў госці запрашу? — Не трэба. Няхай і далей так думае».) Эксперты абяцаюць рост колькасці шлюбаў, заключаных на прыродзе, а не ў рэстаранах, і замену пышных свят на больш дробныя, камерныя мерапрыемствы. Апроч мер бяспекі гэта яшчэ і фінансавы складнік пытання, актуальны ва ўмовах зніжэння даходаў з-за пандэміі. («Стаць дарослым — гэта калі ты з'еў за маму, за тату, за брата, за кошку, а табе кажуць не «Во малайчына», а «Ты што, зноў, гад, усю сям'ю без вячэры пакінуў?!») Памятаеце, як зусім нядаўна расійскую моладзь абвінавачвалі ў тым, што, маўляў, вяселлі для іх — дзеля ўласна самога свята, нейкіх прыгостваў, а не найперш трывалы саюз, стасункі любячых людзей? («— Давай ажэнімся? — Не, не хачу... Я есці хачу! — Дурненькі, дык на вяселлі і пад'ясі...»)

Як на ўсё гэта рэагуюць тыя, хто хацеў бы або хоча вяселля? Парознаму. («Я ў прынцыпе не вялікі аматар высвятляць адносіны, бо пасля гэтага аказваецца, што нікіх адносін у мяне няма».) Напрыклад, летам у Рыме нявесты ўстроілі акцыю пратэсту. («— Чым можна крануць ваша каменнае сэрца? — Паспрабуйце гранёным алмазам».) Яны выступілі за адмену абмежавальных мер на пышныя вяселлі, уведзеныя ўладамі ў сувязі з пандэміяй каранавіруса. У незвычайным мерапрыемстве прынялі ўдзел 15 дзяўчат у белых сукенках. «Я пратэстую, таму што хачу замуж! Маё вяселле давялося перанесці на наступны год, а я ўжо ўсё абмеркавала са святаром, але рэстараны і салоны прыгажосці... З імі не атрымалася дамовіцца», — заявіла адна з нявестаў. Іншыя дзяўчаты прызналіся, што «хочацца гасцей, бесперапыннай весялосці, танцаў да ранку». Нічога не нагадвае? Але дзяўчаты не былі б дзяўчатамі, каб не выдалі яшчэ адзін аргумент на карысць сваёй пазіцыі. Італьянкі заявілі, што «ёсць рызыка, што з-за доўгага чакання жаніхі перадумаюць». («Маша зразумела, што не асабліва прывабная, калі хлопец прымусіў яе кукарэкаць, выйграўшы ў карты на жаданне».) Для дзяўчыны гэта тая яшчэ задачка! («Пасля расставання з ёй ён цэлымі днямі ляжаў на канапе і пачэсваў сваё разбітае сэрца».) Пратэст маладых італьянак падтрымала Асацыяцыя арганізатараў шлюбных урачыстасцяў. («Прыйшла дадому, а на стале запіска: «Усё добра, я ў бабы». Сяджу вось і думаю — муж ці сын...»)



У Японіі ў гэтым кірунку пайшлі яшчэ далей. Там развіваецца новы від паслуг — віртуальны шлюб. («— У маёй жонкі самая найгоршая памяць на свеце! — Усё забывае? — Не, усё памятае!..») Яго можна адсвяткаваць дзе заўгодна: хоць на Марсе, хоць на дне акіяна. Праўда, кажуць, што маладажонам бывае крыху сумнавата падчас такіх цырымоній, бо яны мусяць сядзець у спецыяльна абсталяванай пустой студыі. («Мокрая падлога зрабіла адказ жаніха нашмат больш эмацыянальным».) Каму весялей, дык гэта гасцям. Да плюсоў яшчэ можна аднесці таннасць такога заключэння шлюбу. («Я сабе знайшоў вельмі добрую кватэру: гасцёўня, сталовая, спальня, кабінет... І так зручна — усё ў адным пакоі».)

І напрыканцы — «вішанька на торце». («Для інстытута шлюбу мне не хапіла прахадных балаў».) Гэта вяселле без... жаніха. («Учора нехта абакраў краму інтым-тавараў. Мяркуючы па скрадзенаму, злачынка была адна. Шмат гадоў адна».) Яго прысутнасць не мелася на ўвазе першапачаткова. Жыхарка Саратаўскай вобласці заручылася сама з сабой... («— Дзяўчына, з вамі можна пазнаёміцца? — Адкуль я ведаю, можна вам ці нельга? Спытайце ў сваёй маці.») На такі экстравагантны крок расіянку падштурхнулі пастаянныя пытанні пра тое, калі яна нарэшце выйдзе замуж. Дапяклі, мабыць... («Як правільна прасаваць. 1. Пачынаеш прасаваць. 2. Жонка гаворыць, што няправільна робіш, і пачынае прасаваць за цябе. 3. Гатова!») Варыянт да ўсяго апынуўся самым эканамічным — «нявеста» патрацілася на фату і кальцо. («— Хто сказаў, што любоў і грошы несумяшчальныя? Я люблю грошы».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**



# «Люблю марыць, а часам і падурэць»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Ці можна вас назваць летуценніцай?***

— Напэўна, не болей за когонебудзь яшчэ. Як і ўсе, люблю марыць, а часам і падурэць. Але ёсць шэраг рэчаў, да якіх заўжды стаўлюся сур'ёзна. Да якіх, мабыць, і нельга ставіцца несур'ёзна. Да творчасці, скажам, у якую трэба ўкладацца напоўніцу. Да кахання. Да сямейнага ачага — дома. Да Дома ў больш шырокім, агульным разуменні — Радзімы.

**«Беларускую ж міфалогію люблю шчырай і трапяткой любоўю. Напэўна, дзякуючы Баршчэўскаму і Караткевічу».**

Ну і фэнтэзі, па вялікім рахунку, няхай і забаўляльны, але не летуценны жанр. Забаўляючы, тут можна многае сказаць — і многае даць чытачу. З самым падступным пісьменніцкім разлікам.

***— У інтэрв'ю Навуму Гальпяровічу вы сказалі, што больш чым пісаць, любіце толькі маляваць. Адчуваеце перш за ўсё сябе мастачкай, нягледзячы на тое, што лаўрэатка Нацыянальнай літаратурнай прэміі?***

— Не, я зусім не мастак. Не прафесійны дакладна. Аматар памаляваць — гэта ёсць. Проста, як і літаратурныя студыі, маляванне прыносіць мне асалоду, падбадзёрвае. Дапамагае разгрузіць галаву. А часам дапамагае парадаваць блізкіх і сяброў. Таму — так, люблю маляваць.

***— У часопісе да вашых твораў змяшчаюцца і ілюстрацыі. А вы малюеце сваіх герояў?***

— О, у «Бярозцы» зараз маю аповесць «Першая песня» ілюструе — як і раман «Век людзей» у «Маладосці» — мастачка Валерыя Дзяткова, яна ж Бестрамвайнасць. Звяла нас некалі агульная сяброўка, намесніца галоўнага рэдактара часопіса Света Курганава. І аказалася, што стылістыка, у якой Валерыя бачыць тэксты, вельмі мне блізкая. Менавіта Валерыя стварыла «партрэтную» ілюстрацыю для зборніка «Там, дзе сэрца», і ёй жа належыць дызайн рэкламных картак для гэтай кнігі. Валерыя малайчына, адным словам.

Я сама рабіла шэраг малюнкаў да публікацый, напрыклад, у «Маладосці», і сваіх, і чужых. Мне ўвогуле заўжды прасцей візуалізаваць персанажаў і свет вакол іх. Як толькі ўбачу — «ідзе». І ўсё складваецца.

***— Аднойчы я брала інтэрв'ю ў Алеся Бадака пра конкурс «Першацвет». І калі папрасіла згадаць найбольш выдатных удзельнікаў, «надзей беларускай літаратуры», першым імем, якое ён назваў, было ваша. А як вы ставіцеся да крытыкі сваіх твораў?***

— Мне, безумоўна, прыемна, што Алесь Мікалаевіч прыгадаў маё імя ў шэрагу першых. Датычна надзей беларускай літаратуры — пачакаем яшчэ хоць бы гадоў пяць, пабачым, што атрымаецца ды напішацца. Крытыка ж — гэта нармальная з'ява, як мне падаецца. Дасканаласці не існуе, і таму хораша, калі нехта можа паказаць табе на твае хібы. Скажам, я нядаўна заканчвала новую аповесць, і мой каханы чалавек рабіў вялікую справу: вычытваў кожны раздзел, пазначаючы, што яго насцярожвае або напружвае. Шчыра магу сказаць: так працаваць куды прасцей, тэкст на выхадзе значна лепшы.

Напэўна, усялякай крытыкі хапала, усяго і не прыгадаць. Можа, Пушкін казаў правільна: «хвалу и клевету приемли равнодушно». Што камусьці падабаецца, не пад густ іншаму, і наадварот. Таму дагадзіць усім і ўсім спадабацца немагчыма. Што магчыма — дык гэта працаваць над сабою і над тэкстамі. Адпрацоўваць уласны стыль, уласнае майстэрства. Быць сабою.

***— Дарэчы, а каго з сучасных літаратараў лічыце найбольш выдатнымі, магчыма, будучымі класікамі?***

— Калі шчыра, ніколі дужа не задумвалася пра такую катэгорыю. Думаю, нават самым геніяльным творцам не варта спяшацца «бранзавець» і трапляць у яе. А ўвогуле, у нас ёсць шмат таленавітай моладзі — мне пашчасціла працаваць з многімі з іх, калі была рэдактарам у «Маладосці». І сёння, калі бяру іх кнігі ў рукі, адчуваю гонар. Таму што яны ўсе розныя, адметныя, з уласнымі галасамі. Гэта крута. Яны крутыя.

***— Яшчэ Алесь Бадак тады адзначыў, што ў літаратуру пачало прыходзіць надзвычай шмат дзяўчат. Вы, як сучасная пісьменніца, як думаеце, з чым гэта звязана?***

— З тым, напэўна, што дзяўчаты, як і хлопцы, таксама пішуць. А некаторыя яшчэ і някепска пішуць. Ну і з цягам часу мяняюцца прыярытэты: цяпер жанчына, якая хоча нечага дамагчыся ў творчасці, у кар'еры, не выклікае такога здзіўлення. Не толькі «Kinder, Küche, Kirche» на павестцы дня. Ва ўсіх свае мары, ва ўсіх ёсць магчымасці для рэалізацыі сябе як асобы. Магчымасць выбіраць.




***— На сайце Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў вас ёсць «Блог прафесійнага чытача». Але ці да таго ж вы і прафесійная літаратарка. Як ацэньваеце кнігу: усё ж як чытач ці як творца?***

— «Блог» ад пачатку задумваўся як шэраг чытацкіх уражанняў ад розных кніг. Без маралізатарства, без навязвання сваіх ацэнак. Проста пункт погляду, меркаванне, з якім можна пагадзіцца або не пагадзіцца. І мне гэта падабаецца, таму што для «Блога» магу перачытваць кнігі не па-рэдактарску, наўскос, а ў сваю асалоду, смакуючы. Мая мэта — найперш прыцягнуць увагу да кнігі і падштурхнуць наведвальнікаў сайта да чытання. А што яны вынесуць з таго чытання — ужо іх асабістая справа.

**Ганна ВАРОНКА.**
**Фота дадзена гераіняй.**
**Цалкам інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 16.09.2020 г.

# Ціхае паляванне можа быць небяспечнае

## А ЯНЫ ЯДОМЫЯ?

Безумоўна, ядомымі называюць толькі тры віды грыбоў: белы грыб (ён жа баравік), грузд сапраўдны і рыжык звычайны. Некаторыя спецыялісты дадаюць у гэты спіс яшчэ і лісічкі. Толькі гэтыя грыбы падыходзяць для гатавання страў без папярэдняй апрацоўкі. Астатнія лясныя грыбы, якія мы лічым ядомымі, на самай справе адносяцца да катэгорыі «ўмоўна ядомыя», і гатаваць з іх бяспечна толькі пасля адмачвання або адварвання.

— З улікам змянення экалагічнай сітуацыі я рэкамендавала б перад смажаннем або іншым відам прыгатавання варыць любыя грыбы, у тым ліку і белыя, мінімум у дзвюх водах, якія пасля закіпання трэба зліваць. Потым, у трэцяй вадзе — варыць яшчэ хвілін сорак, каб як мага больш патэнцыяльна шкодных рэчываў перайшло з грыбоў у ваду, — расказвае **намеснік дырэктара РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні» Алена МАРГУНОВА.** — Справа ў тым, што грыбы ў параўнанні з любымі іншымі дарамі прыроды ў большай ступені назапашваюць таксіны. Таму я рэкамендую збіраць грыбы далёка ад трас, у найбольш чыстых экалагічных зонах, у ідэале — у запаведных мясцінах, такіх, напрыклад, як Белавежская пушча. Там умоўна яны будуць чыстыя. Тыя грыбы, што растуць паабапал аўтамабільных дарог, недалёка ад буйных гарадоў і вялікіх гаспадарак, утрымліваюць цяжкія металы. Прычыны — выхлапныя газы, рэшткі сродкаў абароны на палях, ападкі.

Зрэшты, дыетолагі кажуць аб грыбах часцей добра, чым дрэнна. Так, лясныя грыбы — унікальны натуральны прадукт, які падтрымлівае імунітэт, а па некаторых дадзеных, нават павышае супраціўляльнасць арганізма цукроваму дыябету і анкалагічным захворванням. А яшчэ — умацоўвае сардэчна-сасудзістую сістэму: у лясных грыбах змяшчаецца лецыцін, які перашкаджае з'яўленню халестэрынавых бляшак на сценках сасудаў. «Чэмпіёны» па ўтрыманні рэчываў, што перашкаджаюць росту хваробатворных бактэрый, — рыжыкі і апенькі.

## ЦЯЖКАЯ ЕЖА

Цяжкасць пераварвання грыбоў абумоўлена наяўнасцю ў іх хітыну (рэчыва, што надае трываласць панцырам ракападобных). І каб дабрацца да карысных рэчываў, нашай стрававальнай сістэме трэба справіцца з гэтым хітынам, а ён не пераварваецца. Таму грыбы не варта ўключаць у рацыён людзей, якія пакутуюць захворваннямі страўнікава-кішачнага шляху (за выключэннем гастрыту з паніжанай кіслотнасцю), хваробамі печані, дыябетам, пажылым людзям і дзецям да 14 гадоў. Ну, а ўсім іншым пры гатаванні грыбоў урачы рэкамендуюць рэзаць іх як мага драбней — так нагрузка на наш страўнік будзе зніжана.

Колькі варта есці грыбоў за адзін раз? Яны досыць каларыйныя. Напрыклад, 200 г смажаных чырвонагаловікаў раўназначныя па каларыйнасці такому ж кавалку сала, 100 г баравікоў утрымліваюць столькі ж калорый, колькі і 100 г цяляціны. Найбольш каларыйныя грузды, рыжыкі і баравікі — 40 ккал у 100 г.



Масляты, падбярозавікі і чырвонагаловікі ўтрымліваюць 30 ккал у 100 г, лісічкі, махавікі і сыраежкі, а таксама шампіньёны — у сярэднім 15 ккал у 100 г, а самыя дыетычныя грыбы — свінушкі, краснушкі і вешанкі — 10 ккал у 100 г.

**ВАЖНА**

Лясныя грыбы, як вядома, дзеляцца на трубчастыя і пласціністыя. Каб іх адрозніць, трэба зазірнуць пад капялюшык. Усе атрутныя грыбы нашых лясоў належаць да пласціністых. Пласціністыя грыбы, асабліва сыраежкі, старайцеся зрэзаць з ножкай, каб пераканацца, што на ёй няма плёнкавага кольца. Памятайце, што сярод пласціністых ядомых грыбоў такое кольца маюць толькі апенькі, шампіньёны і грыб-парасон стракаты.

## АДКУЛЬ БЯРЭЦЦА АТРУЧЭННЕ?

З атручэннем грыбамі медыкам даводзіцца сутыкацца штогод. І гаворка не толькі пра «дзіцей асфальту», якія вырашылі пакаштаваць грыбнога супчыка і выпадкова набралі бледных паганак. Справа ў тым, што і ядомыя грыбы могуць раптам аказацца неядомымі. Нават у самых бяспечных грыбах у вельмі маленькіх дозах змяшчаюцца мыш'як і сінільная кіслата. У моцную спякоту суадносіны атрутных і карысных рэчываў мяняюцца, і ядомае раптам аказваецца неядомым. На вуліцы горача (або горача было нядаўна)? Адпраўляцца па грыбы не варта.

Грыбы вельмі хутка псуюцца. Яны застаюцца ядомымі толькі чатыры гадзіны пасля таго, як іх зрэзалі. А пры гніенні грыба вылучаюцца рэчывы, падобныя па складзе на «трупны яд». Таму перабраць, пачысціць, вымачыць і адварыць грыбы трэба адразу ж пасля таго, як вы прыйшлі з лесу. Дарэчы, даўжэй за ўсё захоўваюць свежасць грыбы ў плеценых кошыках — іх грыбнікам выкарыстоўваць лепш, чым пластыкавыя вёдры і цэлафанавыя мяшкі.

* Пры варцы трэба памятаць: грыбы гатовыя, калі не плаваюць на паверхні, а апусціліся на дно каструлі. Але лепш паварыць іх крыху даўжэй.

* Кожны від грыбоў лепш варыць асобна ад іншых.

* Чарвівыя, вялыя, падгнілыя — выкідвайце без шкадавання. Як і грыбы, якія вам не знаёмыя або ў якіх вы сумняваецеся.

* І ні ў якім разе не спрабуйце сырыя грыбы падчас збору!

**ВАЖНА**

У народзе лічыцца, што калі запіць грыбную страву алкаголем, то «спірт нейтралізуе яд, калі ён ёсць у грыбах». Гэта зман. Усё адбываецца «з дакладнасцю да наадварот». Алкаголь паскорыць усмоктванне таксінаў у кроў і зробіць атручванне больш цяжкім.

## НЕБЯСПЕЧНЫЯ «ЗАКАТКІ»

Закатаныя слоічкі марынаваных грыбочкаў на зіму — гэта прыгожа, зручна і — небяспечна!

— У хатніх умовах я не рэкамендавала б кансерваваць грыбы, — перасцерагае **начальнік аддзела кансервавання РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні» Людміла ПАЎЛОЎСКАЯ.** — Грыбы — вельмі небяспечны з пункту гледжання мікрабіялогіі прадукт. У іх зদольныя развівацца хваробатворныя мікраарганізмы, атручэнне прадуктамі жыццядзейнасці якіх можа прывесці да смяротнага зыходу.

Гэта, у прыватнасці, Clostridium botulinum, Clostridium sporogenes — вельмі ўстойлівыя ў знешнім асяроддзі мікраарганізмы, што патэнцыяльна могуць быць у вядзерцы з «ляснымі прыгажунамі», якія вы прынеслі дадому. І калі тэрмічная апрацоўка недастатковая, каб знішчыць гэтыя бактэрыі (не толькі вегетатыўныя, але і спаравыя формы), і вы закаталі грыбы ў банку, у анаэробных умовах мікраарганізмы здольныя актыўна развівацца і вылучаць таксіны, якія могуць выклікаць наймацнейшае атручванне. У аэробных умовах гэтыя мікраарганізмы сябе не праяўляць, бо небяспечныя для здароўя не яны самі, а таксін, што яны вылучаюць у працэсе жыццядзейнасці. Падсмажылі ядомыя грыбы — вашаму здароўю нішто не пагражае. А закаталі ў слоік — і, паласаваўшыся, паехалі ў бальніцу.

— Кансерваваныя грыбы павінны быць толькі прамысловай вытворчасці! — адзначае спецыяліст. — На прадпрыемствах пры кансерваванні прадукцыя апрацоўваецца ў аўтаклавах, пры высокіх тэмпературах, доўгі час і пад ціскам. Для кожнага аб'ёму слоіка і для кожнага віду грыбной прадукцыі рэжым стэрылізацыі распрацоўваецца індывідуальна. І гэта дае гарантыю знішчэння і вегетатыўных, і спаравых формаў небяспечнай мікрафлоры. Дадам, што зараз ёсць велізарны выбар грыбной прадукцыі прамысловай вытворчасці на паліцах магазінаў.

***— Ну, а калі ўсё ж такі хочацца захаваць свой грыбны «ўлоў» на зіму, што вы параіце?***

— Можна засаліць грыбы ў бочцы, з доступам паветра. Можна сушыць грыбы: зімой дастаткова будзе іх проста адварыць — і гатаваць з іх любыя стравы. Яшчэ адзін варыянт — замарозіць грыбы на зіму. Перад замарозкай бланшыраваць у кіпені, абсушыць на ручніку і адправіць у маразілку. Хочацца марынаваных грыбочкаў? Замарынуйце і пастаўце ў халадзільнік, не зачыняючы герметычна банку. Такія грыбы трэба з'есці на працягу тыдня. Марынаваць грыбы варта кожны раз нанова: дастаць зімой з маразілкі замарожаныя грыбы, заліць марынадам, пакінуць на суткі — і атрымліваць асалоду.

**ВАЖНА**

Ні ў якім выпадку не купляйце грыбныя (і іншыя) закаткі, якія прадаюць бабулі на рынках і ў месцах стыхійнага гандлю. Гэта сапраўды небяспечна для здароўя: невядома, наколькі ядомыя грыбы ў гэтых слоіках і ў якіх умовах яны былі прыгатаваныя.

## АБ ЧЫМ ГАВОРАЦЬ МЕДЫКІ

— Атручэнне грыбамі лічыцца адным з найбольш небяспечных харчовых атручванняў, — адзначае **ўрач агульнай практыкі 27-й гарадской паліклінікі г. Мінска Міхаіл ШАВЕРДА.** — Часта людзі не могуць адрозніць ядомыя грыбы ад атрутных, ужыванне якіх у ежу можа прывесці нават да смяротнага зыходу. Таксічнасць грыбоў залежыць не толькі ад іх тыпу. Нават ядомыя грыбы, якія выраслі ў экалагічна забруджаным раёне, могуць стаць прычынай атручвання.

Першыя прыкметы атручвання грыбамі звычайна ўзнікаюць праз некалькі гадзін з моманту іх ужывання ў ежу, кажа спецыяліст. Працягласць бессімптомнага перыяду залежыць ад выгляду атрутных грыбоў, іх колькасці, масы цела чалавека, узросту, ужывання алкаголю і г. д.

Аб атручванні грыбамі сведчаць наступныя прыкметы (адна або адразу некалькі):

- млоснасць, ваніты;
- дыярэя;
- болі ў жываце;
- галавакружэнне, галаўны боль;
- слабасць;
- смага.

— У некаторых выпадках з'яўляецца абільная патлівасць, у іншых — узмацняецца слінаадлучэнне, — кажа суразмоўца. — Калі грыбы ўтрымлівалі атруту, якая паражае цэнтральную нервовую сістэму, магчымыя галюцынацыі, трызненне, узбуджэнне, ажыўленне або млявасць, затарможанасць, страта прытомнасці. Могуць быць парушэнні з боку сардэчна-сасудзістай сістэмы і органаў дыхання: падзенне артэрыяльнага ціску, адышка, абцяжаранае дыханне, тахікардыя або брадыкардыя. Сімптомы атручвання грыбамі ў дзяцей праяўляюцца мацней: дзіцячы арганізм больш адчувальны да ўздзеяння таксінаў.

Пры любым атручванні грыбамі займацца самалячэннем недапушчальна, падкрэслівае спецыяліст. Пры з'яўленні нават невялікага недамагання пасля ўжывання ў ежу грыбоў тэрмінова выклікайце хуткую дапамогу або дастаўце пацярпелага ў бальніцу сваімі сіламі.

Пакуль «хуткая» едзе:

* правядзіце прамыванне страўніка: дайце багатае піццё (не менш 1,5—2 літраў кіпячонай вады пакаёвай тэмпературы выпіць дробнымі глыткамі) і выклічце ваніты, націскаючы двума пальцамі або гладкім прадметам на корань языка;

* дайце выпіць актываваны вугаль (з разліку 1 таблетка на 10 кг вагі);

* адразу пасля ачышчэння страўніка пакладзіце пацярпелага ў ложак. Калі яго знобіць — накрыйце коўдрай, паспрабуйце супакоіць. Хвораму неабходна багатае піццё (вада).

**ВАЖНА**

Пры атручэнні грыбамі катэгарычна нельга прымаць прэпараты, якія спыняюць дыярэю. Разам з вадкім стулам выходзяць і таксічныя рэчывы. Калі яго спыніць, гэтыя рэчывы застаюцца ў арганізме і праз сценку кішэчніка працягваюць усмоктвацца ў кроў.

— Наступствы атручэння грыбамі, асабліва калі хворы своечасова не звярнуўся да медыкаў, могуць быць вельмі сур'ёзнымі, — кажа тэрапеўт. — Так, смяротнасць пры атручэнні бледнай паганкай наступае ў 50—90 % выпадкаў. Запозненая медыцынская дапамога пры атручванні мухаморам становіцца прычынай гібелі кожнага другога. Цяжкія атручванні грыбамі могуць стаць



прычынай фарміравання хранічнай пячоначнай або нырачнай недастатковасці, што патрабуе трансплантацыі гэтых органаў. Небяспечна атручванне грыбамі цяжарных жанчын: таксіны могуць пранікаць праз маткава-плацэнтарны бар'ер і выклікаць пашкоджанні плоду, спрыяць узнікненню заўчасных родаў.

Адпраўляючыся ў лес на ціхае паляванне, памятайце галоўныя правілы. Збірайце толькі тыя грыбы, пра якія вам дакладна вядома, што яны ядомыя. Рашуча выкідвайце незнаёмыя грыбы, калі хоць трохі сумняваецеся ў іх ядомасці. Збор грыбоў праводзьце на адлегласці не менш за 500 м ад аўтамагістраляў, удалечыні ад прамысловых прадпрыемстваў і гарадоў. Не бярыце старыя грыбы і экземпляры нават з невялікімі прыкметамі гнілі. Усяго толькі адзін атрутны грыбок можа каштаваць жыцця вам і вашым блізкім!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# ТУТ ЗАПАЛЬВАЮЦЦА ЗОРКІ

**Фінал IV Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства Worldskills Belarus 2020 стартаваў у Мінску. Урачыстая цырымонія прайшла ў спартыўным комплексе «Чыжоўка-Арэна».**



Сёлета ў фінале конкурса спаборнічае больш за 400 удзельнікаў ва ўзросце да 21 года — гэта навучэнцы прафесійна-тэхнічных каледжаў і ВНУ, маладыя рабочыя. Яны будуць дэманстраваць свае навыкі ў 47 кампетэнцыях у сферы вытворчасці, інфармацыі, будаўніцтва, транспартных тэхналогій, паслуг, моды і дызайну. Упершыню будуць прадстаўлены такія кампетэнцыі, як «Тэхналогіі праектавання будынкаў (BIM)» і «Пачатковая адукацыя». На пляцоўцы гандлёва-выставачнага цэнтра на тэрыторыі індустрыяльнага парка «Вялікі камень» падчас двух дзён спаборніцтва фіналісты пакажуць свае прафесійныя здольнасці. Выконваць заданні яны будуць пад пільнай увагай экспертаў.

**Рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерый ГАЛУБОЎСКІ** адзначыў, што ў рамках чэмпіянату WorldSkills традыцыйна спаборнічаюць вучні ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі ва ўзросце ад 10 да 16 гадоў — гэта JuniorSkills. «Сёлета такіх удзельнікаў 116. Яны прадэманструюць свае здольнасці па дзевяці кампетэнцыях. Акрамя таго, па чатырох кампетэнцыях «Тэхналогія моды», «Вэб-дызайн і распрацоўка», «Графічны дызайн», «Сістэмнае адміністраванне» выступяць дзеці з абмежаванымі магчымасцямі па здароўі.

Падчас адкрыцця фіналу конкурсу на сцэне свае візітоўкі прадэманстравалі каманды з кожнай вобласці Беларусі і Мінска. Перад удзельнікамі выступіў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар ПЕТРЫШЭНКА:**

— Рэспубліканскі конкурс Worldskills Belarus арганізаваны па стандартах міжнароднага руху WorldSkills International. Мы ставім перад сабой амбіцыйныя задачы, каб увайсці ў дзясятку, а потым і ў пяцёрку наймацнейшых каманд у гэтым міжнародным спаборніцтве. Спадзяёмся, што на сённяшнім конкурсе яркія прадстаўнікі сваіх рэгіёнаў выступяць годна і самыя лепшыя паедуць на міжнародны конкурс у Шанхай у 2021 годзе.

Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства — гэта своеасаблівая алімпіяда для пачаткоўцаў рабочых і спецыялістаў, звярнуў увагу Ігар Петрышэнка. «Таксама ён дае магчымасць зацікавіць выпускнікоў школ і гімназій у атрыманні рабочых прафесій, садзейнічае павышэнню іх прэстыжу ў грамадстве. Прыемна, што апошнім часам рух WorldSkills набірае ўсё большую папулярнасць у нашай краіне. Калі ў 2014 годзе на першым конкурсе прыняло ўдзел 150 чалавек, то сёлета — ужо больш за 400. Дзякуючы іх мэтанакіраванасці Беларусь на апошнім сусветным чэмпіянаце ў агульнакамандным заліку заняла 15-е месца з 63. Але гэта не мяжа, і мы павінны ўвайсці ў пяцёрку лепшых каманд».

Ігар Петрышэнка звярнуў увагу на тое, што на працягу 80 гадоў у нашай краіне дынамічна развіваецца сістэма прафесійнай падрыхтоўкі кадраў:

— Захоўваюцца лепшыя дасягненні мінулых гадоў. Укараняюцца найноўшыя падыходы, паглыбляюцца партнёрскія адносіны ў адукацыі, вытворчасці і бізнесе. Мы рыхтуем кадры на апераджэнне для эканомікі заўтрашняга дня. Для гэтага дзяржавай створана ўся неабходная матэрыяльна-тэхнічная база. Функцыянуюць рэсурсныя цэнтры — не толькі ў Мінску, але і ва ўсіх рэгіёнах краіны. У іх сканцэнтраваны найноўшыя абсталяванне і тэхналогіі.

Падчас адкрыцця фіналу конкурсу з творчымі нумарамі (усе яны, дарэчы, былі звязаны з рознымі кампетэнцыямі) перад удзельнікамі мерапрыемства выступілі зоркі беларускай эстрады, оперы і балета, вядомыя танцавальныя калектывы краіны. Не абыйшлося і без неонавага шоу. Вечар быў напоўнены ўсмешкамі і моцнай пазітыўнай энергетыкай. Фінал конкурсу прафесійнага майстэрства завершыцца 18 верасня. Жадаем усім удзельнікам поспехаў у найбліжэйшых конкурсных днях!

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**




## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел. 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**

Продавец: **ОАО «Рапс»** (УНП 600068480) Минский р-н, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, тел. 8 017 506-91-51.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **01 октября 2020 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилища (зернохранилище) с инвентарным номером 600/С-124842, площадью 1 474,7 кв. м, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, район деревни Пятевщина | 277 152,00 |
| | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилища (зернохранилище) с инвентарным номером 600/С-124843, площадью 612,0 кв. м, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, район деревни Пятевщина | |
| 2 | Здание неустановленного назначения (конюшня) с инвентарным номером 600/С-160205, площадью 379,7 кв. м, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, д. Каралино, ул. Лесная, 33 | 41 858,78 |
| 3 | Здание специализированное сельскохозяйственного назначения (овощехранилище) с инвентарным номером 600/С-145756, площадью 340,0 кв. м, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, д. Вишневка | 26 595,36 |
| 4 | Здание специализированное животноводства (здание коровника) с инвентарным номером 600/С-121229 площадью 1 788,0 кв. м, расположенное по адресу: 223014, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, 12, район д. Дедовка | 167 897,66 |

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 785-81-56.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 18.09.2020 г. 09.00 по 30.09.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку на участие в торгах по выбранному лоту на сайте **BELTORGI.BY**; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – рассрочка платежа на 3 года. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 11.08.2020 г.



## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже имущества торгово-производственного унитарного частного предприятия «Альетт» Шумеля А.Ф., расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Пестрака, 7

## 20 октября 2020 года

| Вид аукциона | Открытый |
|---|---|
| Предмет аукциона | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-20513 с принадлежностями: подвал ((А1/бл)), водопроводная сеть (а), канализационная сеть (ливневая)(б), кабельная сеть наружного освещения (в), покрытие (проезд на территории)(г), ограждение (д), назначение: здание специализированное для общественного питания, наименование: кафе. Общая площадь: 358,0 кв. м. Расположено по адресу: г. Гродно, ул. Пестрака, 7 |
| Начальная цена продажи | **650 000,00 рублей** без НДС |
| Кадастровый номер земельного участка и размеры | 440100000001001342 площадь: 0,0801 га |
| Месторасположение земельного участка | Гродненская область, г. Гродно, ул. Пестрака, 7 |
| Продавец | Торгово-производственное унитарное частное предприятие «Альетт» Шумеля А.Ф., Гродненская обл., Гродненский р-н, г. Гродно, ул. Пестрака, 7, тел. 8 029 677 69 01 |

Имущественное право земельного участка: право постоянного пользования

Сумма задатка: 65 000,00 рублей

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 8 0152 72 00 10, 72 05 37

Дата проведения аукциона: **20 октября 2020 года.**
Время проведения аукциона: **12.00.**
Место проведения аукциона: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, актовый зал.**
Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 407.**
Дата и время начала приема документов: **21 сентября 2020 года 8.00.**
Дата и время окончания приема документов: **14 октября 2020 года 17.00**

Объект расположен в зоне смешанной производственно-административной застройки, назначение которой по генплану г. Гродно на перспективу сохраняется.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в сроки и порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Адрес сайтов: Гродненского городского исполнительного комитета http://grodno.gov.by, организатора аукциона http://gcn.by**



## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-40989 (назначение – здание гостиниц, мотелей, кемпингов, наименование – здание гостиничного комплекса «Гостиный двор»), площадью 458,7 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, д. Цыборы, 76 с оборудованием и земельными насаждениями: водонагреватель GRF 841 VA ECOUNIT 500-1С, плита электрическая ПЭМ4-020, набор мебели для бара, 4 набора мебели для спальни, набор мебели для фойе, набор мебели для кафе, 2 котла газогенераторных ТЭМ-45, ковровое покрытие, камера видеонаблюдения, панно «Лидский замок», душевая кабина «Тритон», 4 фена настенных, туя «Смагард», можжевельник, туя «Даника».

Лот № 1 расположен на земельных участках:

- кадастровый номер 423685213166000036, площадью 0,4319 га (назначение – для обслуживания гостиничного комплекса), расположенном по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, д. Цыборы, 76. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора), код – 2.7, площадью 0,4319 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0075 га;
- кадастровый номер 423685200660000136, площадью 0,0510 га (назначение – для обслуживания инженерных коммуникаций (водопровод)), расположенном по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, У-13. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора), код – 2.7, площадью 0,0510 га.

Начальная цена продажи – 776 306,16 руб. (семьсот семьдесят шесть тысяч триста шесть рублей шестнадцать копеек) с учетом НДС.

Сумма задатка – 77 630 руб. (семьдесят семь тысяч шестьсот тридцать рублей)

ЛОТ 2: изолированное помещение, инв. № 441/D-2042 (назначение – квартира, наименование – квартира 20), площадью 69,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. 50 лет Октября, 19-20 с оборудованием газовая плита, электрический счетчик.

Начальная цена продажи – 43 723,30 руб. (сорок три тысячи семьсот двадцать три рубля тридцать копеек) с учетом НДС.

Сумма задатка – 4 372 руб. (четыре тысячи триста семьдесят два рубля)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

**Продавец – Лидский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231300, г. Лида, ул. Фурманова, 19, тел. 8-0154-611381**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 19 октября 2020 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 30.07.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 15 октября 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

На варце

# ЗА ПАГРОЗЫ ЎЖЫВАННЯ ГВАЛТУ — 43 СПРАВЫ

**Дадзеныя каля 300 супрацоўнікаў міліцыі за апошнія пяць тыдняў патрапілі ў інтэрнэт. Пра гэта заявіў на брыфінгу начальнік галоўнага ўпраўлення ўласнай бяспекі МУС Андрэй ПАРШЫН. Па яго словах, «з 9 жніўня назіраецца ўсплёск актыўнасці дэструктыўных элементаў, якія спрабуюць пагражаць супрацоўнікам міліцыі, запалохваць і зневажаць іх, а таксама распаўсюджваць пра іх ілжывую інфармацыю».**

— Больш за 250 супрацоўнікаў і членаў іх сем'яў за гэты час адчулі на сабе дэструктыўны націск, — сказаў Андрэй Паршын. — Гэта ўсё мае на ўвазе толькі адну мэту — схіліць супрацоўнікаў міліцыі да таго, каб яны спынілі сваю дзейнасць па ахове грамадскага парадку. Але колькасць супрацоўнікаў, якія па розных падставах звальняюцца са службы, вагаецца прыкладна ў межах аналагічнага леташняга перыяду. Гэта значыць, адток няма, а супрацоўнікі працягваюць несці сваю службу. Пры гэтым яны знаходзяцца ў складаных маральна-псіхалагічных умовах.

Заведзены 43 крымінальныя справы за пагрозы ўжывання гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі. 21 чалавек ужо праходзіць па канкрэтных крымінальных справах з перспектывай прыцягнення да крымінальнай адказнасці з рэальнымі тэрмінамі пазбаўлення волі. 36 грамадзян прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці — гэта штрафы або ўтрыманне пад вартай.

Андрэй Паршын адзначыў, што зараз выпрацаваны дакладная тактыка і методыка дзеянняў, як выкрываць такіх людзей:

— Нашы супрацоўнікі дастаткова падрыхтаваныя і кваліфікаваныя, — заявіў ён. — Кожная знявага і пагроза рэгіструюцца, па гэтых фактах даецца прававая ацэнка. Апрацавана больш за 160 матэрыялаў у рамках крымінальна-працэсуальнага заканадаўства. У пераважнай большасці ўстаноўлены асобы, якія здзейснілі правапарушэнні ў дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Ураджай-2020

# КУРС НА СВАЁ!

## У Гродзенскай вобласці самая высокая ўраджайнасць грэчкі

**Сёлета плошчы пад гэтую культуру павялічаны ажно ў два разы. Зараз яна вырошчваецца ва ўсіх раёнах вобласці. Многія гаспадаркі ўжо завяршылі ўборку, застаецца ўбраць 20 % плошчы. Ураджайнасць значна апераджвае сярэднерэспубліканскі паказчык.**

Гродзенскія аграрыі задаволены: не толькі ўраджай зерневых парадаваў, але і такая капрызная да надвор'я культура, як грэчка, таксама не падвяла. На пачатак тыдня намалочана больш за 5 тысяч тон зерня. Летась на такі ж перыяд гэты паказчык складаў 3,4 тысячы тон. Сёлета самая высокая ўраджайнасць у Гродзенскім раёне — 27,3 ц/га. У лідарах таксама Навагрудскі і Карэліцкі раёны.

Гэтай культуры надаецца важнае значэнне. Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання прынята рашэнне забяспечваць унутраны рынак сваім прадуктам, а гэта 15—20 тысяч тон. Да гэтага часу палавіна неабходнага аб'ёму закуплялася за мяжой, збольшага ў Расіі. Таму ў гэтым годзе ў краіне значна павялічылі плошчы пад грэчку, адпаведна павялічыўся і дзяржзаказ. У Гродзенскай вобласці пад культуру адвялі 4,6 тысячы гектараў, што ў два разы больш, чым летась. А ў філіяле «Агракомплекс «Шылавічы» Ваўкавыскага раёна плошчы выраслі ажно ў тры разы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Цікава

# ДЗЕ ЖЫВУЦЬ «ЧЫРВАНАКНІЖНІКІ»

**Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белкартаграфія» падрыхтавала і выпусціла карту «Жывёлы і расліны Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь».**




Гэтая карта выканаthe ў выглядзе кнігі для дзяцей, на якой можна ўбачыць самых яркіх прадстаўнікоў флоры і фаўны, занесеных у Чырвоную кнігу краіны. Акрамя добра вядомых жывёл і раслін, на карце выразна відаць не толькі вобласць пражывання, але і асаблівасці мясцовасці, ландшафту. Карта выкананая ў зручным фармаце і ў займальнай форме дапаможа дзіцяці запомніць, як выглядаюць жывёлы, дзе яны жывуць, на каго палююць і дзе хаваюцца ад небяспекі.

Акрамя таго, РУП «Белкартаграфія» выпусціла драўляную карту-пазл для дзяцей «Мая Радзіма — Беларусь», якая ў гульнявой форме дапамога азнаёміць дзяцей з геаграфіяй, гісторыяй, народнымі і культурнымі традыцыямі, знакавымі помнікамі архітэктуры Беларусі. Карта-пазл зробленая на трывалай драўлянай аснове і змяшчае буйныя дэталі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Японіі абралі новага прэм'ера



Парламент Японіі большасцю галасоў падтрымаў кандыдатуру Ёсіхідэ Сугі на пасаду прэм'ер-міністра. Ён стаў першым новым прэм'ерам амаль за восем гадоў. Ранейшы кіраўнік урада Сіндзо Абэ падаў у адстаўку па стане здароўя. Чакаецца, што Суга, блізкі саюзнік Абэ, працягне палітыку свайго папярэдніка. Зацвярджэнне яго кандыдатуры прайшло ўчора, за суіскальніка прагаласавалі 314 з 465 членаў ніжняй палаты парламента Японіі. Выступаючы перад дэпутатамі, новы прэм'ер сказаў, што яго непасрэдным прыярытэтам будзе барацьба з эпідэміяй COVID-19. Ён таксама абяцаў рэалізаваць шматлікія праграмы Абэ, у тым ліку яго фірменную эканамічную стратэгію «абэномікa» — прасоўваць наперад структурныя рэформы і абмяжоўваць бюракратыю, перадало агенцтва Reuters. Таксама стала вядома, што малодшы брат колішняга японскага прэм'ера Сіндзо Абэ Набуа Кісі прызначаны кіраўніком Мінабароны Японіі ў абноўленым кабінеце міністраў, паведаміла інфармагенцтва «Кіода». Пасаду кіраўніка МЗС краіны захаваў за сабой Матэгі Тасіміцу. Кіраўнік Мінфіна Японіі Тара Аса таксама застаўся на сваёй пасадзе. Акрамя таго, былы міністр аховы здароўя краіны Кацунобу Като прызначаны генеральным сакратаром кабінета міністраў Японіі.

## Трамп абвясціў надзвычайны рэжым у двух штатах

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп абвясціў, што ў «штаце Фларыда надзвычайная сітуацыя», і распарадзіўся дапоўніць намаганні мясцовых улад па рэагаванні на наступствы ўрагану «Салі» (абрынуўся на Фларыду 14 верасня і працягваецца дагэтуль) аказаннем федэральнай дапамогі. Указ прэзідэнта ўпаўнаважвае Міністэрства ўнутранай бяспекі, Федэральнае агенцтва па надзвычайных сітуацыях «каардынаваць намаганні па аказанні надзвычайнай дапамогі». Яшчэ адным указам Трамп абвясціў надзвычайны рэжым у штаце Арэгон, што сур'ёзна пацярпеў ад лясных пажараў. Федэральная дапамога жыхарам можа быць аказана ў форме прадастаўлення субсідый на часовае жыллё і рамонт дамоў, выдзялення танных крэдытаў для пакрыцця незастрахаваных маёмасных страт і іншых праграм, якія дапамагаюць прыватным асобам і ўладальнікам бізнесу акрыяць ад наступстваў стыхійнага бедства.



## ЕКА вылучыла 129 мільёнаў еўра на абарону Зямлі ад астэроідаў

Еўрапейскае касмічнае агенцтва (ESA — European Space Agency) падпісала пагадненне на суму 129,4 мільёна еўра з прамысловым кансорцыумам на чале з нямецкай спадарожнікавай кампаніяй OHB на стварэнне касмічнага апарата HERA, прызначанага для абароны Зямлі ад астэроідаў. Аб гэтым паведаміў спецыялізаваны сайт Space News. У рамках здзелкі OHB узначаліць распрацоўкі групы кампаній з 17 краін — членаў ESA для падрыхтоўкі вызначанага на кастрычнік 2024 года запуску апарата HERA. Ён з'яўляецца часткай праекта місіі зонда DART амерыканскага касмічнага агенцтва NASA, які плануецца запусціць у кастрычніку 2021-га да падвойнага астэроіда Didymos і Dimorphos. Амерыканскі зонд павінен будзе ўрэзацца ў найменшае з двух нябесных цел — Dimorphos, з тым каб паспрабаваць зрушыць яго з траекторыі сутыкнення з Зямлёй на больш бяспечны шлях.

Неасабісты суб'ектыў

# Хронікі былога памежжа,



## або Ці памятаем мы, аб чым «плачуць кулікі»?

ПРА сваю прабабулю, якая памерла падчас калатнечы Першай сусветнай, я ведаю толькі, што звалі яе Юзэфа. Дзе яе магіла, не ведае сёння ніхто з нашай радні па бацькавай лініі, хоць пражыла яна сваё кароткае жыццё ў той жа вёсцы, дзе нарадзіліся і выраслі ўсе мы. Нават яе дачка, мая бабка, якой Бог даў доўгі век — аж дзевяноста адзін год, не магла сказаць, дзе пахавана маці. Расказвала толькі, што на Валмянскіх могілках, да якіх ад нас самае большае кіламетры два. Памятаю, яна з горычу паказвала на векавыя чорныя елкі ў старой закінутай частцы кладоў — «дзесьці там». І я ніколі не задавала ёй пытання, чаму яна не ведае дакладна, чаму не дагледзела матчыну магілу. Таму што ад нараджэння ведала на яго адказ. Ён быў у адным слове — «мяжа». Мяжа, якой не павінна было быць. Якую правілі, умацавалі, ахоўвалі без нашай на тое волі. Якая стала часткай біяграфіі кожнага з нас — асабліва тых, хто нарадзіўся зусім побач ад яе, прычым не аднаго пакалення.

Дык вось пра прабабку. Пасля заключэння Рыжскага міру мая родная вёска апынулася на «савецкім» баку, а бліжэйшыя могілкі — на «польскім». З-за гумнаў яны вельмі добра відаць, але трапіць на матчыну магілу бабуля не магла доўгія васямнаццаць гадоў. Калі ж у 1939-м пайсці туды стала магчымым, яна ўжо нічога не знайшла. За амаль два дзесяцігоддзі драўляны крыж згніў і паваліўся, магіла зраўнялася з зямлёй, вакол параслі дрэвы. Муж Юзэфы Адам, бабулін бацька, у 1936-м лёг у зямлю не каля жонкі, а на савецкім баку — на Яшэўшчыне...

ТАКАЯ вось гісторыя не краіны, не грамадства — адной асобна ўзятай сям'і. Мяжа, якой няма ўжо восемдзесят адзін год, і сёння прысутнічае ў нашым жыцці. У грыбы ці проста прагуляцца з малымі мы ходзім у Заставу, а ў маліны — на Кантрольную. Назвы родныя, знаёмыя з дзяцінства, а прыезджым дзіва, і даводзіцца тлумачыць ім, што ў лесе была пагранзастава, а Кантрольная — гэта, уласна і ёсць колішняя кантрольная паласа. Раней гэта было часцей, але яшчэ і сёння часам даводзіцца назіраць, як зусім старыя ўжо людзі і іх не менш сівыя дзеці ходзяць сярод чыстага поля, пільна ўзіраючыся ў зямлю, бы нечага шукаючы. Мы, мясцовыя, добра ведаем, што яны шукаюць — хоць які знак на месцы, дзе гадоў дзевяноста таму назад стаяў іх хутар ці невялікая, у некалькі хат, вёска. Невялікія паселішчы з памежжа яшчэ да раскулачвання і рэпрэсій проста павывозілі далей на ўсход. Кагосьці зусім далёка — у Сібір, а маім землякам пашанцавала больш — яны трапілі пад Петрыкаў. У нашай памежнай вёсцы амаль няма і не было ветэранаў, ваенных удоў і сірот. Затое амаль усе — удовы і сіроты (а мы іх унукі і дзеці) 1937—1938 гадоў. У нас рэпрэсіўнай машыне вельмі проста было выконваць расстрэльны план — побач мяжа, значыць, усе польскія шпіёны...

На памежжы нікому ні на адным, ні на другім баку добра не было. Гадоў пятнаццаць таму я рабіла на гэту тэму рэпартаж, тады яшчэ былі жывыя бабулі і ў нашай вёсцы, і ў суседняй Волме, што была «пад Польшчай», якія яшчэ памяталі тыя часы. Расказвалі са слязьмі на вачах пра раз'яднаныя амаль на дваццаць гадоў сем'і, пра нясправджанае каханне, пра забытыя магілы — у кожнага свая асабістая гісторыя. З «савецкага» боку згадвалі пра тое, што маглі зацягаць на допыты ў НКУС з-за каровы, якая забрыла «ў Польшчу», пра пагранічнікаў-бязбожнікаў, якія стралялі па буслах і па абразе, спрадвечнай мясцовай святыні. З «польскага» — пра выбрыкі пана, на якога працавалі ўсе ў наваколлі, і пра тое, як цяжка было быць беларусам. Адна бабуля з горкай усмешкай дэкламавала: «Kto ty jestes? //— Polka mala. // — Jaki znak twyj? // — Lilja biala» і расказвала, як гэты «Катэхізіс польскага дзіцяці» настаўнік убіваў ім бізуном, бо вымаўленне было не тое, бо між урокаў гаварылі па-беларуску. А дома за тое ж яшчэ дабаўляў бацька, бо, казаў, калі не будзеш гаварыць і пісаць па-польску, не станеш чалавекам, будзеш усё жыццё парабкаваць...

УЖО тады, на пачатку 2000-х, гэтыя эпізоды нашай, па сутнасці, найноўшай гісторыі здаваліся нечым далёкім і, падазраю, камусьці нават незразумелым. А што казаць пра дзень сённяшні? Я вось думаю: ці сучасныя школьнікі ўвогуле ведаюць, пра які час і якія падзеі піша ў апавяданні «Сірочы хлеб» Янка Брыль? А чытаючы ў вершы Максіма Танка «Песня кулікоў» (спадзяюся, яго пакінулі ў школьнай праграме) «Бачыш: у нас голад, // людзі жывуць бедна, // хлеб на стол кладзецца толькі для гасцей... // Можа, хопіць бульбы з дзён асенніх, медных // да вясны, да першых з выраю гусей...» і «Хочацца вучыцца ў мове сваёй роднай», нашы дзеці ведаюць, пра што пісаў паэт, якому на той час было дваццаць чатыры гады? А яны ведаюць, хто такі Сяргей Прытыцкі? І чаму вуліцы ў многіх невялікіх гарадах названыя ў гонар 17 верасня? Ім пра гэта расказваюць? Ім кажуць пра тое, што ў верасні 1939 года ў нашай гісторыі адбылася падзея, якая па значнасці сваёй саступае хіба толькі трэцяму ліпеня 1944-га?

ПАДЧАС круглага стала, які днямі праводзіўся ў «Звяздзе», прагучала: апошні раз дзень уз'яднання Беларусі святкаваўся ў 1949 годзе. Пасля, каб не наступаць на балючы мазоль суседняй дзяржаве, пра дату не тое што забыліся, але стараліся яе не выстаўляць напаказ. Але, улічваючы сённяшнія рэаліі, можа, якраз менавіта гэта і варта зрабіць? Дзень яднання народа — можа, гэта тое, што нам менавіта сёння вельмі патрэбна?..

Ад той мяжы на нашай зямлі і сёння засталіся сляды. Ці засталіся яны ў нашай памяці? Ад адказу на гэта пытанне многае залежыць.

Напрыклад, застанецца купалава «нашу Айчыну без нашае волі, як тую аўчыну, ў шматкі папаролі» адлюстраваннем падзей стагадовай даўнасці, ці нашы ўнукі будуць думаць, што гэта пра нас, сённяшніх, было напісана.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# ЧАС СТРАЙКАЎ

## Чаму ліхаманіць Польшчу?



**Прафсаюзы гарнякоў Верхняй Сілезіі і Дамброўскага вугальнага басейна паведамілі, што прынялі рашэнне аднавіць дзейнасць міжсаюзнага камітэта пратэсту і страйкаў рэгіёна. Польскія шахцёры мяркуюць распачаць надзвычайную бестэрміновую забастоўку. Прычына маштабных пратэстаў — Стратэгія развіцця паліўна-энергетычнага сектара Польшчы да 2040 года (PEP2040), які прыняў 15 верасня польскі ўрад, паведаміла газета Rzeczpospolita. Да рашучых дзеянняў гарнякоў падштурхнулі планы дзяржаўнай энергетычнай палітыкі. Прафсаюзы лічаць, што іх рэалізацыя будзе азначаць ліквідацыю большай часткі прамысловасці, размешчанай у Сілезскім ваяводстве. У іх афіцыйнай заяве падкрэсліваецца, што гэта немінуча прывядзе да страты працоўных месцаў у горназдабыўнай, металургічнай і сталеліцейнай прамысловасцях. У доўгатэрміновай перспектыве беспрацоўе закране і аўтамабілебудаванне, якое ўжо знаходзіцца ў глыбокім крызісе, а таксама іншыя сектары энергаёмістай вытворчасці. Калі мець на ўвазе, што прыкладна трэць працаздольнага насельніцтва Польшчы занята ў прамысловасці, то сітуацыя выглядае надзвычай складанай. Чаму ліхаманіць Польшчу?**

### ЗАКРЫТЫЯ ШАХТЫ

Сёння выкапнёвае паліва забяспечвае 80 працэнтаў патрэб Польшчы ў электраэнергіі, пры гэтым усе вугальныя шахты нядаўна былі цалкам закрыты, а работы спынены. Праўда, не з-за палітыкі ці эканомікі, а ў сувязі з чарговай успышкай каранавіруса сярод шахцёраў. Закрылі часова, але атмасфера ў грамадстве пагоршылася. У галіне занепакоіліся, што каранавірус — толькі падстава, а ўлады тэрмінова рэалізуюць план па зніжэнні здабычы.

Дванаццаць шахт у Польшчы на тры тыдні закрывалі ў чэрвені, калі COVID-19 пачаў масава распаўсюджвацца сярод шахцёраў. «Гэта часовае прыпыненне работы вугальных шахт, у якіх былі зафіксаваны выпадкі віруса, але не былі правераны ўсе работнікі. Пакуль шахты закрыты, аднак заробкі людзям будуць выплачвацца», — супакойваў віцэ-прэм'ер, міністр дзяржаўных актываў Польшчы Яцэк Сасін.

Як адзначыла Financial Times, рашэнне было сустрэта не з удзячнасцю, што ўлады клапоцяцца пра здароўе супрацоўнікаў, а са злосцю. Гарнякі падазравалі (як пазней аказалася, не дарма), што такім чынам спрабуюць «расправіцца» з усёй галіной. Шахцёры паабяцалі масавыя забастоўкі.

Агенцтва Reuters ужо напрыканцы ліпеня, спасылаючыся на свае крыніцы, паведаміла, што кампанія PGG — найбуйнейшы ў Польшчы вытворца вугалю — рыхтуецца да плана па рэструктурызацыі, згодна з якім плануецца закрыць шахты Ruda і Wujek, у якіх працуе 7,7 тысячы чалавек. Некаторыя крыніцы сцвярджалі, што ў гэтым плане таксама ўзгадваецца аб скарачэнні заробкаў супрацоўнікаў сектара, а да 2036 года — аб поўнай адмове ад здабычы ў галоўным «вугальным рэгіёне» — Сілезіі. Улады гэтыя чуткі катэгарычна абвяргалі. Што ж насамрэч было ў плане, так і засталося таямніцай. PGG прадставіла яго некаторым прафсаюзным дзеячам і членам урада, аднак пяцігадзінныя перагаворы скончыліся нічым.

Перагаворы паміж прафсаюзамі горназдабыўнай прамысловасці і польскім урадам працягваюцца з канца ліпеня. Нагодай для іх стала рашэнне віцэ-прэм'ера Яцэка Сасіна закрыць як мінімум чатыры шахты, яшчэ чатырнаццаць «замарозіць» на тры гады, пры гэтым прывязаць памер узнагароды шахцёрам да эфектыўнасці іх працы. Кіраўнік Сілезска-Дамброўскага аддзялення прафсаюза «Салідарнасць» Дамінік Колаж яшчэ ў жніўні заявіў, што перагаворы прафсаюза з урадам не прынеслі ніякіх вынікаў, у сувязі з чым рабочыя будуць вымушаны аб'явіць страйк.




### НЕПАСІЛЬНАЯ НОША

Крызіс польскай вугальнай галіны доўжыцца ўжо больш за 30 гадоў. «Залатым стагоддзем» называюць 1980-я, калі ў Польшчы здабывалі 19 працэнтаў ад сусветнай вытворчасці каменнага вугалю. Краіна экспартавала па 40 мільёнаў тон у год, а здабывала па 200 мільёнаў тон і лічылася вугальнай звышдзяржавай. Да канца «дзясятых» паказчыкі ўжо не дасягалі 70 мільёнаў тон у год, а сама Польшча стала імпартаваць расійскі вугаль. Як адзначаюць эксперты, знакаміты пасляваенны лозунг «Polska weglem stoi» ( «Польшча — гэта вугаль») канчаткова сыходзіць у гісторыю.

Нягледзячы на тое, што польскія ўлады рэгулярна паўтараюць, што ў іх няма мэты, прыкрываючыся пандэміяй, зрэзаць працоўныя месцы ў горназдабыўной галіне, у якой заняты дзясяткі тысяч чалавек, эксперты настойваюць, што гэта непазбежна, піша dp.ru. Еўрапейская камісія абвясціла барацьбу са зменай клімату адным з асноўных прыярытэтаў. Пры гэтым вуглездабыўная прамысловасць Польшчы — адна з галоўных перашкод у дасягненні гэтай мэты, адзначаюць у Брусэлі.



Вугаль у Польшчы генеруе сёння столькі электраэнергіі, колькі ўвесь астатні Еўрасаюз, узяты разам.

Як піша Financial Times, з-за таго, што ЕС пастаянна робіць больш жорсткімі экалагічныя патрабаванні да сваіх членаў, вуглездабыча для эканомікі Польшчы становіцца непасільнай фінансавай ношай. У апошнія гады гэтая галіна ў краіне сутыкаецца з шэрагам крызісаў, а залежныя ад вугалю энергетычныя прадпрыемствы толькі падлічваюць страты. Дарагую электраэнергію, атрыманую з дапамогай вугалю, спрабуюць замяніць на больш танныя крыніцы аднаўляльнай энергіі.

Пандэмія COVID-19 усё гэта толькі абвастрыла — у першым паўгоддзі 2020-га, пасля ўвядзення каранціну, энергаспажыванне ў Польшчы скарацілася на пяць працэнтаў. З дапамогай вугалю было генеравана на 12 працэнтаў менш, чым за такі ж час летась. І нягледзячы на тое, што гэта відавочна часовая тэндэнцыя, выкліканая каранавірусам, яна прымусіла вярнуцца да дыскусіі — менавіта калі і як Польшча збіраецца адмовіцца ад вугалю і перайсці на альтэрнатыўныя варыянты паліва.

«Пакуль яшчэ ёсць свабода для манеўру, мы павінны рэалізаваць трансфармацыю электраэнергетычнага сектара. Калі мы зараз не зробім неабходных рашэнняў, вытворцам энергіі ад гэтага лягчэй не стане. Замест таго нам прыйдзецца шукаць выхад у апошнюю хвіліну, а нашы магчымасці ўжо вельмі абмежаваныя», — лічыць кіраўнік найбуйнейшага польскага энергетычнага прадпрыемства PGE Войцех Даброўскі.

### ВЕЦЕР І АТАМ

У новым праекце дзяржаўнай энергетычнай палітыкі прадугледжваецца, што ў выпадку хуткага росту расцэнак на квоты на выкіды $CO_2$ у 2040 годзе Польшча будзе вырабляць толькі 11 працэнтаў электрычнасці з вугалю (цяпер гэтая доля складае 70 %). Да цяперашняга часу сыравіна будзе цалкам выключана з ужытку ў бытавых печах. Плануецца, што асноўным палівам стануць афшорная ветраэнергетыка і ядзерная энергія. На апошнюю робіцца асаблівая стаўка і ўжо цяпер вывучаецца грамадскае меркаванне. Як стала вядома, будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Польшчы падтрымліваюць больш за палову насельніцтва. Вынікі сацапытання на гэтую тэму апублікавала Міністэрства клімату Польшчы на сваёй старонцы ў Twitter. Яно праводзілася кампаніяй IMAS International з 31 ліпеня па 12 жніўня. У апытанні ўдзельнічалі 2028 жыхароў ва ўзросце ад 18 да 64 гадоў.

Паводле даследавання, 57 працэнтаў палякаў не супраць будаўніцтва ў Польшчы атамнай электрастанцыі. Сярод жанчын будаўніцтва АЭС падтрымалі 48 працэнтаў апытаных, а сярод мужчын — 72. Людзі з вышэйшай адукацыяй у 70 працэнтах выпадкаў выказваліся за будаўніцтва АЭС, у той час як сярод тых, хто толькі скончыў школу, падтрымліваюць будаўніцтва АЭС 53 працэнты рэспандэнтаў. За мірны атам больш ахвотна выступаюць жыхары буйных гарадоў і людзі з вялікім даходам — адпаведна 66 і 67 працэнтаў рэспандэнтаў. Але і сярод жыхароў невялікіх гарадоў 57 працэнтаў падтрымалі будаўніцтва ў краіне атамнай электрастанцыі.

### УЛЬТЫМАТУМ ПРАФСАЮЗАЎ

Трэнды зразумелыя, аднак прафсаюзы польскіх шахцёраў лічаць, што працэс непазбежнай трансфармацыі павінен грунтавацца на грамадскім дыялогу і зыходзіць з таго, што кожнае ліквідаванае працоўнае месца ў цяжкай прамысловасці будзе заменена эквівалентнай гарантаванай прапановай у новых галінах. Прафсаюзы таксама заклікаюць урад Польшчы неадкладна прыняць меры для блакавання чарговага ўзмацнення жорсткасці кліматычнай палітыкі Еўрасаюза. Яны патрабуюць вяртання да будаўніцтва вугальнага блока на Остраленскай электрастанцыі, прапануючы ўкараніць там тэхналогію CCS (улоўліванне і захоўванне вуглякіслага газу), а таксама мадэрнізаваць старыя вугальныя блокі магутнасцю 200 МВт. Прафсаюзы гарнякоў настойваюць, каб прэм'ер-міністр Польшчы Матэуш Маравецкі асабіста ўдзельнічаў у абмеркаванні Стратэгіі развіцця паліўна-энергетычнага сектара Польшчы да 2040 года (PEP2040).

Зараз перагаворы паміж прафсаюзамі і ўрадавай камісіяй зайшлі ў тупік. Прафсаюзы ўжо вылучылі ультыматум, што калі да 21 верасня кіраўнік урада не ўзначаліць перамовы, то ўся горназдабыўная прамысловасць краіны сыдзе на страйк. Кіраўнік Сілезска-Дамброўскага аддзялення прафсаюза «Салідарнасць» Дамінік Колаж нагадаў, што Маравецкі пачынаў сваю палітычную кар'еру як дэпутат прафсаюза «Салідарнасць» ад Ніжнесілезскага ваяводства ў 1998—2002 гадах. «Прэм'ер-міністр павінен асабліва пераканаць нас у тым, што ён дэпутат ад Сілезіі. Ён не павінен забываць, што дзякуючы той частцы грамадства, якая працуе ў цяжкай прамысловасці, ён дамогся такога добрага выніку на выбарах», — заявіў Колаж.

Прафсаюзы ўжо заявілі, што калі да 21 верасня пытанне не будзе вырашана, гарнякі распачнуць у краіне маштабны страйк. Так што ў польскіх уладаў ёсць глабальныя ўнутраныя праблемы, якія варта неадкладна вырашаць. А не распрацоўваць планы па «выратаванні» Беларусі. Як-небудзь без вас разбяромся.

**Пётр ДУНЬКО.**

● **Тым часам**

### НА РУДНІКУ ЗАГІНУЎ ШАХЦЁР

**На рудніку Рудылтовы ў Польшчы адбылася аварыя, у выніку якой загінуў шахцёр, паведаміў Dziennik.**

46-гадовы работнік аглядаў падземны пераход, і яго засыпала камянямі. Аб гэтым расказаў Томаш Глагоўскі, прадстаўнік Polska Grupa Gyrnicza, якой належыць дадзеная шахта. Прычыны адрыву камянёў стануць зразумелыя пасля аварыйнага расследавання. Вядома, што падземнага штуршка горнай масы ў шахце не было. Аварыю даследуюць мясцовае шахцёрскае ўпраўленне і штаб-кватэра арганізацыі Polska Grupa Gyrnicza.

Паводле звестак Вышэйшага горназдабыўнога ўпраўлення (WUG) у Катавіцэ, загінулы шахцёр стаў 11-й ахвярай са смяротным зыходам у гэтым годзе ў польскай горназдабыўной прамысловасці і шостым у вугальных шахтах. Летась на польскіх шахтах загінулі 23 чалавекі, з іх 16 — на каменнавугальных.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н. М., извещает о проведении 2 октября 2020 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 55 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи: 1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %** | | | | |
| **Местонахождение лота:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4в | | | | |
| 1 | **КТП 804**, инв. № 10000007 | **6 030,00** | 301,50 | 603,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 17 сентября 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 30 сентября 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда», затраты за публикацию извещения на сайте www.bankrot.gov.by, затраты по ранее несостоявшимся торгам в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» стр. 127–129.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 13.02.2020 г. № 29 (29143). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельторгтехника» (продавец) извещает о проведении 21 октября 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 330/С-13595**, **площадью 296,7 кв. м,** назначение – здание нежилое, наименование – **двухэтажное кирпичное нежилое здание. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **341500000014000004** площадью **0,0506 га** – для размещения объектов промышленности. **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1).** Адрес: Гомельская область, Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Саета Г. Е., 3 | **79 700,00** | 3 985,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельторгтехника», г. Гомель, ул. Барыкина, 161.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 730-99-11 – Герасименко Инна Антоновна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельторгтехника»):** р/с BY69 BLBB 3012 0400 0695 7600 1001, БИК BLBBBY2X в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, г. Гомель, УНП 400069576, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 17 сентября 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов) заканчивается 19 октября 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи не позднее **12 (двенадцати) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

И З В Е Щ Е Н И Е  О  П Р О В Е Д Е Н И И  А У К Ц И О Н А

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Солигорскводстрой» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ МАСТЕРСКОЙ КИРПИЧНОЙ ДЛЯ РЕМОНТА ТЕХНИКИ

